Дзённік 1998

Вячеслав
Владимирович Адамчик

SHOUT
SHARE
IT

- Вячаслаў Адамчык

Вячаслаў Адамчык
Дзённік 1998

Спадчына: “сярод сваіх і чужакоў яна нам ласкай матчынай”, — пісаў Купала. Мне ў
спадчыну дасталася старая шафа з бацькавымі рукапісамі. Чарнавікі апавяданняў і
раманаў, нататнікі і дзённікі. Шафа, поўная сшыткаў, спісаных татавай рукою. Што
з імі рабіць? Як да іх падступіцца? З якога боку? Вырашыў — з адваротнага. Выбраў
дзённікі за 1998–2001 гады, набраў і раздаў у часопісы; 2001 — у “Полымя”, 2000 у
“Дзеяслоў”, 1999 у “Маладосць”, 1998 у “ARCHE”. Калі пройдуць часопісныя
публікацыі, набяру і раздам 1978–1997, папярэднія дзённікі за 1962–1977 гады ён
паспеў падрыхтаваць і апублікаваць сам. Вынікам гэтай працы будзе кніга: Вячаслаў
Адамчык, “Дзённік 1962–2001”.

22 студзеня 1998 году.

Учора, убачыўшы кароткую тэлеперадачу, дзе на ўвесь экран прыгожа і
фацэтна глядзеўся адзін з найсімпатычнейшых і найстарэйшых нашых літаратараў,
нечакана і нават з дзівам для сябе зразумеў, чаму ён выжыў, прайшоўшы ўсе кругі
пекла: фронт, палон (армія Ўласава), Рур, Данбас — нямецкія і савецкія вугальныя
капальні. Аказваецца, ён няўзнак, спадцішка, не на ўвесь голас, але ўмее пахваліць
начальства. Дабрата Машэрава… А чым жа ж скончылася? Здрадаю, самаю найгоршаю,
вынішчэннем даастатку беларускага пакутнага слова.

Мне, прынамсі, прыгадваецца, як ён <М. Я.> ціхенька сядзеў, ссутулена і
прыгнута ўцякаючы ад усіх спрэчак, сварбы, выступленняў, таемна толькі
распытваючы пра судовыя працэсы, што ішлі над карнікамі з батальёну Дзерлівангера…

Да іх, палонных, што перакінуліся на службу да немцаў, у яго, палоннага, меўся

асаблівы інтэрас.

Пра пачатак вайны, уцёкі з Менску, акружэнне пад вёскаю Мясны Бор ён умеў

яскрава, шматкалёрна расказваць, напісаў шэра і бескалёрна.

Не менш унікальная рэч наша памяць. Асабліва памяць дзяцінства.

Сваю расстраляную запальнымі снарадамі ўлетку 41-га Варакомшчыну я магу

аднавіць па нейкіх нязначных на першы погляд, але звабліых для сямігадова[га]

падлетка рэчах. Напрыклад, па карычневым паліваным кату-скарбонцы, што стаяў на

выштукаванай шафе, ці па настольнай керасінавай лямпе з малочным абажурам, па

металічным будзільніку на трох ножках з нікеляваным, нібы веласіпедным, каўпачком

званка наверсе, нават па жоўтым пачатку кукурузы, тады яшчэ не моднай, што сеялася

колькімі калівамі пры мяжы ў вясковым гародзе. Дзядзькаў хутар, што прыгожа і

паэтычна ўздымаўся шарымі будынкамі над высокаю рачною стромаю, з якое

абвальваліся круглыя, як перакаці-поле, кусты ядлаўцу, — па высокіх шастах

радыёантэны: на стале ў хаце чарнела каробка дэтэктара з пружыністымі дужкамі

навушнікаў.

Адпаведна кожнай гэтай дэталі ў памяці аднаўляецца ўся хата, цесны двор —

брукаваны ці не, вуліца, адгароджаная парканам ці выкладзенымі ў рад валунамі-

камянямі, і паўстае ўся спаленая вёска.

Дзіўна, але я хачу ў яе вярнуцца.

Пасля полудня я зрабіў круг, праехаўшы тралейбусам № 5 за Чэрвеньскі рынак у

свой ЖЭС, каб праясніць справу з кватэрнай аплатай і рамонтам залітага ваннага

пакою.

“Вам будзе паведамленне, вам пазвоняць”, — сказаў высокі, падобны да

выблядка Л. начальнік, мінаючы ўсю чаргу перад глухімі дзвярыма.

Пятніца, 22 студзеня 1998 году.

Да ўсходу сонца, раніцаю, у акне зверху — густа-сіняе неба,

пасярэдзіне —

ясна-сіняе, знізу — светла-зеленаватае.

На поўдні над шпілем вакзалу — сярпок старога месяца, а злева ад яго —

ружовы, падсвечаны сонцам дым. І сонца ў іскрыстай кароне — яно прасвечвае белыя,

празрыстыя, як марля, перыстыя аблокі.

Ужо марознымі вечарам і раніцаю над праспектам Скарыны, як над горадам

Нукусам у спякотнай Каракалпакіі, стаіць залаты пыл. Учора надвячоркам у ім ажно

хавалася нізкае сонца.

На тратуарах і на праезджай паласе пластом ляжыць падсушаны, перамешаны з

калійнаю соллю пясок, якім пасыпалі снег і лёд. І аўтамабілі, як на пясчанай дарозе,

падымаюць хмары пылу.

17.20. Пад сонца і марозік па бясснежнай дарозе (снег, лёд толькі ў лесе),

акружанай зялёнай рунню, з'ездзілі на дачу. Каля жалезнай, прывязанай на вяровачку

брамы нас — стары "мерседэс" — сустрэла з брэхам гання галодных сабак. З

старажоўкі выйшаў малады вартаўнік з чорнай павязкай ("язычок") на воку. З-за

дзвярэй вызіраў мілавідны тварык ці не п'янай старажыхі.

Вартаўніку падарылі трохлітровы слоік марынаваных гуркоў і торбу з буракамі.

Нехта ўжо спрабаваў у шыбе адкалупаць штапікі — улезці ў дачны дом.

Дадому ехалі праз ждановіцкія дачы. Я ўбачыў нялюдскі, без даху,

двухпавярховы цагляны дом пад старымі бярэзінамі — дачу Быкава. Яна спланавана

напэўна лепш, чым мая, але эстэтыкі, хараства ў ёй няма. Куды больш фацэтна

глядзеўся дом нікому невядомага гэбіста Ягорава.

Нядзеля, 25 студзеня 1998 году.

9.10. Як учора — марозны (–7 °С), бясснежны ранак. Сонца ў марлі расцягнутых,

паласатых хмараў з кавалачкам ружова-жаўтлявай тэнчы (вясёлкі) (з правага ад сябе

боку).

Учора — Чэрвеньскі рынак, дзе мы з Нінаю, абышоўшы ў

белым

аднапавярховым доміку мясныя сталы, назапасіліся харчамі на тыдзень. У канцы дня —

Міраслаў з пляскатаю бутэлечкаю брэндзі. Лячыўся, перабіваў боль, бо яму і рвалі, і

свідравалі зубы. Расказваў пра напытаныя кватэры, якія аглядаюць, каб купіць адну з іх

пад офіс.

На вул. Янкі Купалы, ці, праўдзівей, на рагу пр. Скарыны і вул. Купалы —

чатырохпакаёвая (першы паверх) — страх якая дарагая. Побач з кінастудыяй прадаецца

трохпакаёвая, напалавіну таннейшая.

Аўторак, 27 студзеня 1998 году.

19.50. Не магу ўжо без агіды глядзець рас. тэлебачанне, слухаць абрыдлую

балбатню таўстамордых куліковых, строевых, прымаковых…

Сёння, убачыўшы на другі бок вуліцы чорную лайку з белым хвосцікам, белым

каўняром і белымі лапамі, сам-насам смяяўся: як назваць сабачку — белахвосцік ці

чарнамордзік?

Некалькі гадзін праседзелі з Нінаю перад дзвярмі юрыстак у натарыяльнай

канторы, але справу з тастаментам (мая) і дараваннем ці адарваннем кватэры (Нініна)

так і не залатвілі — не хапіла ўсіх даведак і розных копіяў.

Панядзелак, 30 студзеня 1998 году.

8.30. З носу зноў ідзе кроў. Боль у галаве, звон у вушах. Не магу варухнуць

рукамі. Дрыжыць сэрца. Гатаваў сабе манку і чакаў, што рухну там, каля газавай пліты

на кухні.

Гаснуць усе спадзяванні. Усплываюць думкі пра адно і тое ж…

Не дапісаныя апавяданні, не створана кніжка дзённікаў, засталіся толькі ў

планах аповесці і п’есы.

Бязвольны, чуць жывы. Не магу перамагчы сваю слабасць, каб уключыць

электрамашынку. Як казала маці, вянуць рукі.

17.20. Белы мядзведзь, што ледзьве ўжо ходзіць, на прыгнутых нагах, сёння

ўручыў граматы расійскім тэлежурналістам за іхняе, як

сказала дыктар з Масквы,

уважительное отношение к презид. Лукашенко. Аднак Расія цэніць прадажнікаў і

здраднікаў. Вайна, прыхаваная, таемная, падпаленая рускімі фашыстоўцамі і

нацыяналістамі (Бабурын), ідзе за Ўкраіну. Як усім абабураным (абасцаным) хочацца

вярнуць страчаную імперыю. Але фігу — не выйдзе, позна схамянуліся. Прыбалты,

каўказцы і азіяты адчулі ўжо смак незалежнасці: хто захоча адзець хамут ці ярмо руска-

азіяцкай няволі? Казахі, узбекі, туркмены, літоўцы, украінцы?

Серада, 28 студзеня 1998 году.

8.30. Прачнуўся ледзьве жывым. Прыйшоў на кухню, і з носу на кашулю пачала

капаць кроў. Галава як звон. Мусіць, трэба прылегчы.

Нездароўчаю пайшла ў паліклініку і Ніна.

Ад змены надвор'я мы абое занядужалі ці што?

Аўторак, 3 лютага 1998 году.

9.30. Больш як паўгадзіны за сталом, а фрашку пра нізенькага і клыпатага, што

пэўна перахварэў на ангельку, музыканта Гальяша так напісаць і не мог.

Ды, зрэшты, хацелася напісаць не пра яго, Гальяша, што граў у Варакомшчыне

вечарынкі і ў часе п'янай бойкі мог схавацца ў сенцах, накрыцца ночвамі і пераспаць

перадрагу, а пра пераклад беларускіх летапісаў на сучасную наркомаўскую мову, дзе

нашае імя Гальяш перадаецца праз рускае Ілля, а беларуская ідыёма "з ласкі божае"

чамусьці перакладаецца на расійскі лад — "з міласці божае".

І гэта ў неблагой і патрэбнай кніжцы з серыі "Беларускі кнігазбор" — "Летапісы

і хронікі".

Не зразумеў і здзівіўся, дзеля якой патрэбы перакладалі "Баркулабаўскую

хроніку", бо харство, каларыт і арыгінальнасць беларускага слова страціла свой бляск,

незвычайную першароднасць, пацямнела і сцерлася, як старая манета. Адбылося ўсё

наадварот — дзеяпіс не аднавіўся, а змерк і пацямнеў.

Дзякуй Богу, я маю на руках тыя/тры акадэмічныя тамы

беларуска-літоўскіх

летапісаў, выданыя яшчэ праз Мікалая Ўлашчыка, і магу зазірнуць у арыгінал. Можа з

ласкі божае будуць перавыданыя і яны.

Серада, 4 лютага 1998 году.

8.10. Чуемся нездароўчымі — і я, і Ніна. У яе задуха, алергія, у мяне —

несціханы боль галавы, што аддаецца ў правае вока. Праўда, я вінаваты сам —

прычасціўся і справакаваў гэты боль. Звечара ўспухла і налілося крывёю павека. Вока

заслязілася. Яно і сёння нібы запарушана — не дае спакою. А над ім, у скроні, — боль.

З носу зноў паказалася кроў.

Нарэшце афармлены завяшчанні. Праўда, нам з Нінаю давялося паўдня

пратаўчыся ў чарзе перад дзвярыма натарыуса, каб аформіць дакументы — мне на

кватэру, Ніне — на офіс.

Учора, зайшоўшы познім вечарам, Міраслаў кампенсаваў нашыя страты на

дзяржпошліну і выдаткі за юрыдычную кансультацыю: цяпер, куды ні ступі, усюды

мусіш плаціць.

Даўно мы не вярталіся ў лепшыя традыцыі графаманска-сталінскай прозы, сёння

забытых і пахаваных навечна стаховічаў-гурскіх, аднак кніжкі дранчукоў-марчукоў-

лукшаў, выданыя па лініі самвыдату, паказваюць на тое, што можна, зрэшты, вярнуцца

і ў эпоху неандэртальства.

Не зборнікі прозы, а смярдзючыя смеццявозы, падфарбаваныя ў зялёны

лукашэнкаўска-энкавэдзісцка-юдаўскі колер, пачалі ўжо дыхаць адпаведным пахам з

паліцаў мінскіх кнігарняў.

Сівенькі — не дзіва, што ў дзеда сіва, — як законнік (манах) з келлі якога-

небудзь падмаскоўнага манастыра, Іван Антановіч шчабятліва ненатуральнаю

расійскаю моваю — нібы няма ў бел. дзяржаве законнай і гістарычнай беларускай? —

расказваў пра інтэрас Беларусі да рэспублік Югаславіі.

Але ж і там, не ў прыклад прадажнікам антановічам-

лукашэнкам, гавораць на

серба-харвацкай. Ад свайго роднага не адхрышчваюцца.

Чацвер, 5 лютага 1998 году.

20.00. Гутарка з Валодзем у яго офісе (п. Скарыны, 14, кв. 24), куды я падняўся

разам з крывалапым суседскім сабачкам. Валодзевыя планы — кіно, кніжкі, — ад якіх я

жахаўся.

Спусціўся з шостага паверху ўвесь узмакрэлы ад гарачыні і гутаркі, а ў двары

мяне астудзіў пухкі снегапад і лаянка прастытутак, што п'янаю зграяю вываліліся з

нейкае блізкае канторы.

"Да я не хочу зарабатывать деньги п…, а иметь настоящую работу!" Я азірнуўся:

сярод двух рослых мужчын пахіставаліся апранутыя ў кажушкі дзве асалавелыя

маладзіцы. Ім гадоў пад сорак. Мне міжволі падумалася: як жа ж яны гадуюць і

даглядаюць сваіх дзяцей?

Пятніца, 6 лютага 1998 году.

8.30. То дыміць завейны дробны снег, то ў разрывах сіняватых хмараў залаціцца

сонца і глыбокі блакіт зманвае вока, як светлая надзея на штосьці таемна-радаснае. Не

дарам у падлеткавыя гады на глухой адзіноце верылася, што там, за напухлымі, мяккімі

і зыркімі хмарамі, званымі адна на адну, існуе жыццё, і шархоткімі галубінымі

крыллямі ўзмахваюць кучаравыя анёлы, і сядзіць сівенькі, басаногі бог.

Субота, 7 лютага 1998 году.

9.05. Стаяў каля пліты на кухні, варыў сабе манную кашу і нават не ўчуў, як на

кашулю на грудзях закапала з носу кроў. Покуль не ўбачыў цёмна-чырвоныя рагі.

У галаве болю вялікага няма, ёсць адчуванне п'янаватай цяжкасці і звону ў

вушах.

Прылёг у кабінеце на канапу, але й не ўлежаў, падняўся да стала.

Пасля ўчарашняй адлегі сёння –5 °С, марозік. З непрыветна-абложнага неба

працярушваецца ледзьве відочны сняжок.

І вось чарговая бяда — са столі ў ванным пакоі капае вада. На пятым паверсе

над намі ўсю ноч тупалі, весяліліся і не закруці[лі] краны, ці што? Трэба зноў званіць

дыспетчару.

11.30. Нарэшце прагуляўся. Вядома, больш па магазінах — шукаў вяршкі. Іх

цяпер у міг вока разбіраюць.

На праспекце сустрэў былых цэкоўскіх фюрэраў. Яны азіраліся на мяне, як

ваўкі.

Нядзеля, 8 лютага 1998 году.

Гэтак маўчаў Мележ, да якога няпрошанымі ўварваліся спярша Шамякін, потым

— Чыгрынаў. Апошні нават падбадзёрваў, адпраўляючы на той свет Мележа: “Няма

чаго, Іван Паўлавіч, хвалявацца: літаратура застаецца ў надзейных руках”. Тады ён быў

сакратаром Саюзу пісьменнікаў і ствараў эпапею, перапісваючы жыўцом цэлыя

старонкі з шматтомніка “Вялікая айчынная”, нашпігаванага ілжывай і савецкай

дакументалістыкай.

Каля кантэйнераў ужо ідзе бітва за смецце: малады нагамі таўчэ старэйша[га],

што прысеў на кукішкі і на снезе перабірае нейкія знойдзеныя транты.

19.50. Па расейскім тэлебачанні няма ўжо ніводнай цікавай перадачы. Як

абрыдлі ўсе гэтыя барсукі ці парсюкі Сванідзе, што паўтараюць бачанае і чутае.

Панядзелак, 9 лютага 1998 году.

Два разы — у суботу і пятніцу — заходзіў у ЦУМ (купляў дыван) і два разы пры

дзвярах бачыў кабету з бурачковым спітым тварам. У яе на грудзях вісела скарбонка, а

на галаве была завязаная белая хустка з чырвоным крыжыкам.

Калісьці расійскі гісторык Васіль Ключэўскі праваслаўных пастыраў і іхніх

наложніц называў тунеядскай моллю. Сёння гэтая моль яшчэ больш сфальшывілася,

спілася і разбэсцілася. І колькі яе з сатанінскай дзікай Расіі налятае на безабаронную

Беларусь.

Спярша з'ездзіў у "Белгіпразем" — праектны інстытут землеўпарадкавання

(пэўна не так ён называецца) на Казінца, 86, дзе ўзяў копіі актаў на прыватызацыю зям.

(дачных) участкаў, заплаціўшы ажно 600 тыс. руб., потым — у райвыканкам

(Кальварыя), дзе пастаяў перад замкнёнымі дзвярмі, бо пасля полудня не было прыёму.

У чацвер прыйдзецца прайсці ледзьве не той самы круг.

Серада, 11 лютага 1998 года.

8.00. Перажыта бяссонная пакутная ноч.

У першым сне, пасля якога і прачнуўся, снілася ўсхваляванае ветрам жыта. Я,

напружваючы ўсе сілы, цяжка брыў па ім. Ад дарогі ў кірунку нашага лесу, які даўно

спілаваны і выкарчаваны, але які не раз уваскрасае перада мною ў маіх снах.

У тунелі пераходу — Арсень Ліс з палкаю (наехаў "форд"), на праспекце —

трохі захмялелы Сцяпан Міско, паказваючы на транспарант "13 лютага Машэраву —

80": "Ён уваходзіў у групу Сікорскага і расстрэльваў заходнебел. падпольшчыкаў і

рэвалюцыянераў у 1943 годзе. У мяне ёсць дакумент-спраўка".

Нядзеля, 15 лютага 1998 году.

15.20. Абышоў наўкруга ўсе харчовыя магазіны, а вяршкоў так і не купіў —

нідзе няма. Выцягваючы худую шыю, каля гарэлачнае крамы стаяў <Татур>, колішні

знакаміты бабнік і нястомны п'яніца. Яму ці не восемдзесят? Усе маралісты і

цвярозанікі даўно паўміралі, а ён яшчэ пільнуецца кілішка. Як чы[й] лёс. Танк некалі

выцікоўваў, хто колькі п'е і колькі мае каханак. Пэўна ад зайздрасці, што сам не

дабраў. У яго была адна ахвота і прагнасць — ордэны і медалі. Іхні бляск яго спакушаў

болей, як бляск жаночага сцягна.

Аўторак, 17 лютага 1998 году.

Зранку ўчора цяжкі дзень: банк, перад дзвярыма якога, каб заплаціць пошліну, я

добра вымак, потым — аддзел райвыканкаму, дзе я задыхаўся

ад гарачыні, чакаючы,

покуль афармяць выпіску паўторных актаў на прыватызацыю дачнага ўчастка

(арыгіналы ў часе пярэбараў згубіліся).

Нарэшце — магазіны.

Дадому вярнуўся ледзьве жывы.

13.00. Заходзіў Валодзя. Наша гутарка на кухні, ад сённяшніх праблемаў Іраку і

Каўказу да яго звышцяжкай і акружанай падазронасцю і выведамі працы.

У Вільні Аленаю куплена кватэра. Дзесьці поруч з сінагогаю. Але хто ў ёй будзе

жыць?

Серада, 18 лютага 1998 году.

13.30. На пераходзе вуліцы каля паштамту, калі я ўслед за жанчынаю пайшоў на

зялёны святлафор, з праспекту на мяне на ўсёй хуткасці скіраваў іржавы (жыгуль)

самаходзік. За баранкам сядзеў нейкі вусаты лукашэнкавец. Я ледзьве ўскараў

вывернуцца. Мне ўспомніўся Арсень Ліс, на якога і наехаў гэтакі самы злыдзень.

Як напладзілася сёння нехрысцяў, што толькі і думаюць, каб што скрушыць,

разбіць, зламаць і знішчыць.

Чацвер, 19 лютага 1998 году.

Жыву адчуваннем страху смерці, асабліва прачнуўшыся ўночы і задыхаючыся

ад тытунёвага дыму, што пранікае аднекуль у спальню, ад гарачыні ў сэрцы, болю ў

галаве і ламоты ва ўсім целе.

Штодзённая змена надвор'я — то мароз, то адлега — перабываецца вельмі ўжо

цяжка. Гэтыя кіслыя дні шкодзяць і Ніне. Хоць у яе задуха пачынаецца разам з алергіяй

— чырвона-агністымі плямамі, што ўкрываюць усё цела.

+7 °С. Ні зіма, бо няма снегу, ні вясна, бо няма сонца. Хмурны, насуплены дзень

з вільготным паўднёвым ветрам. На пляцы Незалежнасці і на праспекце дзьме, як з

рэактыўнага сапла.

У людных, цесных і задушлівых тралейбусах нясцерпна смуродзіць нямытымі

бамжамі і атрутнымі лілова-апухлымі алкаголікамі.

Ледзьве жывымі вярнуліся з Нінаю з Чэрвеньскага рынку, так і не купіўшы ні

цялячай вантробкі, бо была цёмная (карычнева-сіняя), ні свінога мяса, бо аказалася

мала грошай.

Субота, 28 лютага 1998 году.

11.30. Камароўскі рынак, як у часе акупацыі, акружаны паліцэйскімі патрулямі.

Іх, у плямістай блакітнай форме, усюды па двое. Цэны — не дакупіцца, таксама як

вайною. І ўсё ж такі мы з Нінаю адшкадавалі дзвесце тысяч на цялячую вантробку.

Сабе — і, вядома, Чэсіку. Балазе ўчора “гуманітарную дапамогу” аказаў Міраслаў.

Купілі і тварагу. Дарэчы, заўсёды падбіраем кабету з беларускай гутаркай. Калі чуем

нетутэйшы расійскі акцэнт — абыходзім. Чужы чалавек заўсёды падазроны.

Серада, 4 сакавіка 1998 году.

Уздоўж жоўтага дому з карычневым мокрым дахам ідзе шыракаплечы і

касалапы мужчына ў касматай, намоклай шапцы, падмахвае сабе чорнай папкай на

раменьчыку і нясе па лужынах перавернуты глыбока ўніз свой адбітак.

Ён чымсьці нагадвае мне Максіма Танка. Грузнасцю, хадою, паставаю ці гэтаю,

намоклаю, як бабёр, рудаватаю шапкаю.

Танк, салідны мужчына, мне здаваўся болей падобным да каваля ці мельніка,

хоць і аўтар “Энеіды” Вергілій быў таксама рослы, пастаўны і меў воблік селяніна, калі

верыць Светонію і яго “Тайнам рымскага двара”.

Адзін хіба Купала выглядаў без ніякіх скідак на паэта, як, вядома, і Багдановіч.

Толькі на астатніх размножаных фотаздымках малады Багдановіч зарэтушаваны і

падроблены пад вусатага фатографа Ждановіча (Чывіса), які рабіў гэтыя пераздымкі.

У старога дзеда, што намагаецца пераадолець косы завулак, каб падняцца ім на

праспект Скарыны праз арку міма нашага дому і магазіну падпісных выданняў, з

кожным днём крок робіцца ўсё карацейшым і карацейшым.

Сёння ён, здаецца, ступае
на месцы, памагаючы сабе ляскай (тросцю) і прасунуўшыся наперад не больш як на
сантыметраў дзесяць.
Ён, вастраносы сівы мужчына, заўсёды ў адной уніформе — штучным зношана-
парудзелым чорным футры, гэтакай жа штучнай шапцы і ў вайсковых злінялых штанах,
здаецца, нібы хворы на голаў. Я помню яго яшчэ з трынаццатага тралейбуснага
маршруту, тады адзінага, што і [неразб.]. Ён, гэты мужчына гадоў пяцідзесяці,
апрануты ў вайсковы шынель і фуражку з чырвоным аколышам, сядзеў заўсёды на
пярэднім сядзенні і, пераймаючы трубу, напэўна барытон, губамі выдзімаў вайсковыя
маршы. Мне здавалася, што ён быў калісьці ў вайсковым аркестры.
20.30. У Расіі вэрхал і лямант у абарону гэтак называнага русскоязычного
элемента ў Латвіі. Нават іржавымі брэжнеўскімі пашчэнкамі варушыў гугнявы
Прымакоў. А хто, і дзе, і калі заступіўся за латышска- ці беларускамоўнае
насельніцтва?
Чацвер, 5 сакавіка 1998 году.
14.25. Сустрэча з Валодзем на праспекце Скарыны, звыклая гутарка, што
пераходзіла ў нервовасць і дробную сварбу (“Ды я нікога не баюся! Я магу плюнуць на
Лукашэнку і Ельцына! Пра Алену здымаюць фільм!”). Потым, у прадуктовым магазіне
ўжо, бліскаючы ўстаўнымі залатымі мосцікамі, — адстаўнік Марцынкевіч, у
старамодным капелюшы, у старамоднай куртцы (“Я адступаў ад Зэльвы, біўся на
Бярэзіне, пад Магілёвам”). А за акном — навалы сівых, з сіняватым сподам, вясновых
хмараў. Яны сплываюць на ўсход, не чапляючыся за ветразі з вострымі гарматнымі
штырамі стадыённых (чатырох) асвятляльнікаў.
<…>
Субота, 7 сакавіка 1998 году.
7.15. Не сплю з 5-ці. Збіраліся былі з Нінаю з’ездзіць у Ракаў

на рынак.

Дакляраваў узяць у свой “форд” ці “опель” сусед. Але ён, мусіць, паехаў, забыўшыся

пра нас, — учора быў пад газам, калі запрашаў.

Аўторак, 10 сакавіка 1998 году.

Сухі, прадзьмуты скразнякамі праспект. Пад нагамі — лёд, у вочы — дробная

жарства. Цяжка і трохі касалапа насустрач мне — адутлаваты, у рыжай, насунутай на

вушы шапцы адзінокі Навуменка. Не размінуцца — павіталіся. Я, чуючы смяртэльна-

лядовы холад ад яго рукі, кажу:

— Вось, хацеў купіць томік Карла Ясперса.

— Каго?

— Кніжку Ясперса, — крычу.

— Салаўёва? — ён дастае з кішэні хустачку і выцірае свой прастуджаны нос.

— Ясперса, чуеця?

— Ну, чую, але ён не пісьменнік.

— У тым жа ж справа, што філосаф.

— Трэба чытаць… — ён моршчыцца, варушыць пальцамі, нібы абмацвае

грашовую купюру, — рускіх, як, напрыклад…

— Розанава, — падказваю я.

— Не, — ён зноў цярэбіць трыма пальцамі, як паказвае сілуэт зайчыка на сцяне.

— Бярдзяева?..

— Ага, — нарэшце з палёгкаю ўздыхае ён і ловіць хустачкаю распухлы

пачырванелы нос.

— Мяне цікавіць Ясперс. Яго тэорыя вінаватасці, праўдзівей — пакаяння

нямецкага народу.

— Вінаватымі яны сябе не лічаць. Вось і цяпер Расія стане прыдаткам Захаду,

крыніцай сыравіны… Украіне Крым аддалі…

А потым быў праклён на непакорных чачэнцаў і няўдзячных прыбалтаў.

— А як жа нам, беларусам? — пытаю.

— Кніжкі не выходзяць. Я ўжо нічога добрага не чакаю. Засталося толькі

перавярнуцца, але пад тралейбус не ляжаш…

Мы развіталіся. Я пайшоў, чуючы ізноў смяртэльны холад яго рукі.

Талстой у 70 яшчэ дзіка раўнівы, нязгодлівы, незгаворлівы. На кіёчак апіраецца,

а ў сваты ідзе.

Чацвер, 12 сакавіка 1998 году.

Успомніўся Скрыган з яго задзірыстым носікам ды яго ўяўная храбрасць і

даверлівая пахвальба ўхажорствам за ленінградскай перакладчыцай:

— І бутэлечку вінца распілі/раскаштавалі.

— Няўжо?

— Дзіва што.

Яму, Скрыгану, здаецца, было ўжо за восемдзесят.

І мне помніцца наша праходка над стромымі берагамі крынічнай Іслачы,

сонечны пагодны верасень, кіёчкі ў нашых руках і спачын пад дубамі, што асыпалі

спелыя жалуды, і зноў, як ён казаў, яго сцежкаю праз трысцё, каля завінаў, атуленых

знямоглымі старымі вербамі, ізноў залаты пясчаны і абрывісты грудок з цёплымі

хвоямі, ласкавы вецер у расхрыстаныя грудзі, рачны/лугавы скошаны прастор лясное

даліны са звілістаю, нястрымнаю рэчачкаю ў шпалерах алешніку…

Субота, 14 сакавіка 1998 году.

14.30. Ніна ідзе ў тэатр на “Тутэйшых”. Я іх, дарэчы, калісьці бачыў — вельмі

слабаваты, па-дзіцячы крыклівы і валтузлівы спектакль. Тэатр Янкі Купалы

ператварыўся не ў народны правінцыйны, а ў вясковы драмгурток.

Рэжысёры — малапісьменныя людзі, магілёўскія правінцыялы, артысты без

гонару, грацыёзнасці, дыкцыі і высокай адукацыі.

Аўторак, 17 сакавіка 1998 году.

8.20. Учора непатрэбная спрэчка з сынамі. Хоць яны, Валодзя і Міраслаў,

вымагаюць ад мяне немагчымае: выпатрабаваць у камітэце паліграфіі ліцэнзію на

выдавецкую дзейнасць. <…>

Учора папрасіў у сыноў: выдайце хоць адну маю кніжку. Не выдадуць. Міраслаў

тут жа ж абязвечыў мяне: “Мы выпускаем тое, што купляецца. А тваю ж кніжку не

прадасі”.

Чацвер, 19 сакавіка 1998 году.

8.15. Учарашняе:

Камітэт па друку. Дзве гадзіны ў чарзе перад кабінетам начальства. <…>

Не прынёс уцехі і мой заход у выдавецтва “Мастацкая літаратура”: кніжку ў

друк не здалі.

Дырэктар, падрыгваючы ножкамі, рвецца, кажуць, у прэзідэнцкую зграю і

беларускамоўных рэдактараў мяняе на расійскамоўных. Вось адкуль пачынаецца

вынішчэнне беларускага слова. Кніжку маю ўжо няма каму адрэдагаваць.

Каб хоць чым узрадаваць і абнадзеіць сябе, купілі з Нінаю новы дыван. Балазе

“Нёман” выплаціў неблагі ганарар.

У кватэры бязлад: другі дзень тынкоўшчыкі рыхтуюцца атынкаваць у ванным

пакоі столь, але руху ніякага — то пяску няма, то цэменту, то сіта, то лесвіцы.

Адшкадаваўшы ад ганарару некалькі сот рублёў, нарэшце набыў К.Ясперса

(праўда, 1 том) і Вайнінгера. Бо з пенсіі ўжо кніжкі не купіш.

Я не зношу ні брэх сабакі, ні сіпаты голас прэзідэнта.

Кажуць, асіпласць чалавеку пакідае ў спадчыну заразлівая хвароба — пранцы.

Субота, 21 сакавіка 1998 году.

Ніна на белым пікапе з чорнымі аконцамі паехала ў Ракаў на рынак. Паклікаў

сусед, наказаўшы яшчэ ўчора вечарам.

Паслухаўшы ўчарашні гістэрычны крык мінскага вусатага, як прусак, конюха,

падумаў, што надыходзіць блізкі канец ці яго разбойнага панавання, ці яго вар’яцкага

жыцця. Запомнілася яго фраза: “Запад при помощи национал-фашистов в угоду

лжедемократам Москвы хочет свергнуть в Бел. президентскую власть” (ці праўленне?).

9.00. Вярнулася з Ракава Ніна ледзьве не з пустою карзінаю (кашом). Купцоў на

рынку аказалася ў дзесяць раз больш, чым прадаўцоў. Вусаты прусак ужо забараніў

прадаваць цялят. І на ўвесь торг быў адзін баран і некалькі свіных туш. Не зважаючы на

высокія цэны, наезджы люд усё хватаў з рук.

Пятніца, 3 красавіка 1998 году.

3 гадзіны ночы. Не сплю. Перажываю, круцячы (пракручваючы) у памяці

тасьму, на якой у кожным кадры буйным планам мільгаюць агідныя твары. Апомніўся і

пытаюся ў сябе: чаму бачыцца толькі благое? Няўжо памяць не зрабіла засечкі на

добрым?

І ўбачылася затравелая малаезджаная дарога сярод сіне-ружовага жыта.

Падменены бацькам на пашы, я бягу дадому снедаць. Мне, басаногаму, усяго шэсць. І

хутаранскі сыты кот валачэ па разоры, схапіўшы зубамі між вачэй, злоўленага зайца.

Ужо нежывога.

Чэрвеньская светлая нядзелька. Мяне чакаюць на стале пухкія грэцкія аладкі і…

кароценькая, на паўгадзіны, свабода.

Кажуць, старасць пачынаецца тады, калі пачынаюцца ўспаміны. Яна пачалася ў

мяне заўчасна, нават у дваццаць гадоў. Я ўспамінаў светлы нядзельны ранак. Сябе на

затравелай дарозе сярод жыта. Успамінаў у трыццаць, сорак. Потым — у пяцьдзесят…

Цяпер.

Хрыпата ў грудзях перакочваецца, як пранік па качалцы, — грук-грук-грук.

Чорны памёр у новай, толькі што палучанай кватэры ў доме на Савецкай вуліцы.

Вокны выходзілі на плошчу, на таполі, што шарэнгаю ішлі ад фабрыкі-кухні. Але ж па

якой старане стаяў дом? На той, што засталася, дзе вісіць мемарыяльная дошка Шырме,

ці на той, што гадоў трыццаць назад разбурылі? Але ўжо і ў Віткі, кніжку якога калісьці

рэдагаваў і ў якой паўторна прачытаў пра гэта, ужо не спытаеш.

Нават забылася, што Чорны, адчуўшы, што не можа гаварыць, намагаўся яшчэ

напісаць запіску: “Заві пісьм…” Але не дапісаў — страціў прытомнасць.

Гадаю сам і баюся патэлефанаваць яго дачцэ (Чорнага) — Рэні, каб не пачуць ад

яе, што будынак разабралі. Адзін з тых (трох) невысокіх двухпавярховых дамоў трохі

збоку ад касцёлу. А можа, у тым, дзе быў “залаты магазін”? Успомніўся і драўляны

асадзісты дом на рагу Ленінградскай і Савецкай, дзе размяшчалася рэдакцыя газеты

“Літаратура і мастацтва”, і трамвайная лінія, што ішла ад вакзалу ўздоўж

універсітэцкага гарадка і зварочвала на Савецкую, а з яе — ужо на Валадарскага і —

уніз… Мы ўскоквалі тут, недзе каля рэдакцыі “Літ. і мастацтва”, у грукатлівы трамвай,

спаласаваны на падлозе драўлянымі рэйкамі, і ехалі на Нямігу — там быў універсітэцкі

інтэрнат у двухпавярховым доме з надворнымі драўлянымі лесвіцамі, жалезнаю

брамаю, забрукаваным дваром і культмагам на першым паверсе. Няміга, 21, пакой №

5…

Серада, 8 красавіка 1998 году.

Мая гутарка з хлопцамі — стварыць насуперак бальшавіцкім і пэн-клубаўскім

згуртаванням свой гуманістычны літаратурны звяз ці хоць бы суполку — не знайшла ў

іхняй душы водгаласу (водгуку). У іх даволі свайго клопату. А супрацьстаяць

дзяржаўным структурам яны не могуць: небяспека страціць работу. Бо і так з усіх бакоў

абложаныя канфідэнтамі і іхнімі даносамі.

Гілевіч, якога спаткаў на праспекце, — ён, як ксёндз, у чорным плашчы і

чорным берэце, і ружовашчокі, як ксёндз, — прымаў маю ідэю, але бачыў і марнасць

справы: у суполку, як заўсёды, прашыюцца розныя здраднікі і прадаўцы.

18.30. Тэлефонная перамова з рэдакцыяй часопісу “Беларусь”. Мая паездка на

вул. Захарава. Чорнымі “іксамі” (Х ці +) адзначаныя тыя фразы ці старонкі, якія мусяць

быць вынятыя. Мой ультыматум. Не ведаю, чым усё скончыцца, але свае 13 ці 15

старонак я мушу забраць.

Цэкоўскі слізняк Шабалін, тып адкрыта прадажны, спадзяецца вытаргаваць <…>

яшчэ на пару гадоў рэдактарскае крэсла.

Але яны, як мне здаецца, ужо распараджаюцца не сваім часам.

Па дарозе завітаў у “Полымя”. Можа, прапанаваць туды сваё апавяданне?

Праўда, яно мне штосьці не пасуе. Паўторы, паўторы…

Чацвер, 9 красавіка 1998 году.

Словы з нашае варакомскае гаворкі (гутаркі): страхалюд, азіят, злыдзень, таўлуй

(гультай, абібок).

Дзеразавацца (жарты строіць з малым). Дзеці дзеразуюцца і шалеюць.

Дзеразуешся як маленькі. Праманьваць — жартаваць.

Паліто як уліта сядзіць на ём. Акурат як шыта на яго.

Панядзелак, 13 красавіка 1998 году.

У славенскім слоўніку натрапіў на слова slichta (шліхта) і ўспомніў варштат, што

займаў паўхаты, маці ў такую велікодную пару за кроснамі. Паткаўшы, яна час ад часу

шліхтуе — мажа/націрае, макнуўшы шчотку ў міску з клейкім крухмалам і семенем,

шырокую пасму асновы, што ідзе з навою ў нічальніцы і берда.

Ці не паўвека мінула, а як яскрава і выразна ўспомнілася.

Серада, 15 красавіка 1998 году.

9.00. Я абяссіліў сябе ўчарашняй злосцю, што ператварылася ў невыносную

бяссонніцу. І вось пад нудны дождж сяджу спаралізаваны ўсімі болямі.

Занадта крыўдлівы стаў. Прымаюся да ўсяго. А для здаровага жыцця патрэбна

дробка абыякавасці. Як дробка солі ў кожнай страве.

У Расіі несціханы гвалт і лямант у абарону русскоязычных, што насяліліся і

распладзіліся ў Латвіі. Ніхто толькі не бароніць бяспраўных і галодных у самой Расіі.

Уздымаючы на шчыт чужыя праблемы, уладу купіўшыя ў Маскве і Крамлі

(нямцовы, лужковы і тулеевы) намагаюцца заглушыць справядлівы гнеў сваіх

абяздоленых і ўтаіць, затуманіўшы вочы свету, уласнае казнакрадства і прадажнае

гандлярства.

Для Расіі гэта не нова, калі разгарнуць Ключэўскага. Ды санкцыі не раз ужо

прад'яўляліся, асабліва перад чарговым паходам на Рыгу. Яшчэ задоўга да Рыжкова ці

цяперашняга Лужкова, нават з часу Пятра.

У Беларусі роўнасць правоў ператварылася ў роўнасць бяспраўя. Я палучаю

пенсію, адэкватную [пенсіі] прыбіральшчыцы. Страціўшы матчыну мову, мушу

гаварыць на слэнгу ці жаргоне калгаснага брыгадзіра. І, як калгасны брыгадзір, у слове

з трох літараў рабіць чатыры памылкі — яшчо.

Іронія і парадокс лёсу: за беларуса, пакрыўджанага ў Латвіі, можна заступіцца,

за беларуса, бяспраўнага і зганьбаванага на сваёй жа Бацькаўшчыне, — не.

Нашы карэнні спадцішка і па-зладзейску падсякаюць, каб дрэва ўсохла.

Пятніца, 17 красавіка 1998 году.

16.45. Мужчына, абмоклы на вясновым дажджы, без шапкі, лысаваты, аброслы

барадою, вузкавокі, падобны да Салжаніцына, пакапаўшыся ў кантэйнерах з смеццем,

нясе пад пахаю свой скарб — каляровую торбу — і, накульгваючы, пакідае заліты

дажджавою вадою наш двор.

Вось табе і адзін дзень Івана Шухава ў акружанай спецназам сённяшняй

непрытульнай Беларусі.

<…>

Нядзеля, 19 красавіка 1998 году.

Усё ж па-беларуску трэба пісаць растопленае волава, а не расплаўленае. Топкае

сала, але і топкі метал.

Перайкі каля рыжаватых, нагнутых абадамі стрымбулёў голага маліннік: ястраб

задраў сітаўку. Таму ўчора, перапуджаныя трагічным здарэннем, яны не садзіліся ў наш

гарод. Між імі існуе, маецца нейкая свая, чалавекам не спасцігнутая, інфармацыя.

І трэба ж: перагараваўшы зіму, прыляцела пташачка з выраю і згінула тады, калі

настала пара звіваць гняздо.

Аўторак, 21 красавіка 1998 году.

Дом літаратара, ці ўжо корпус управы аператыўнай управы. Настылы,

адключаны ад ацяплення. Рада. Ссутулены, з дрыготкімі рукамі Зуёнак, кучаравы,

нечым падобны да партрэтнага Валошына. Няголены па-гебрайску, з адутлаватым

тупым тварам Дудараў. Хваравіта-злосны, з сінімі тонкімі губамі Бураўкін.

Навуменка з праваленым ротам. Падобны да нейкага снежнага чалавека,

шыракаплечы і грузны Гніламёдаў. На зарослым, шчаціністым вялікім твары ані іскры

розуму…

Выбіралі на пасаду старшыні прахадзімца і чужынца з цягучым-нудным голасам

Някляева…

Куды ж ніжай можна апускацца?

Пятніца, 24 красавіка 1998 году.

Ад з'езду пісьменнікаў прыкры асадак на душы: залішне шмат было нервовага

крыку, як, дарэчы, і п'янага (Сыс).

Гутарка пра літаратуру ніяк не магла прасачыцца праз наш адчай і боль —

Гілевіч, хоць і паўтараўся, і быў, як заўсёды, аднастайны ў сваіх прамовах, але гаварыў

слушную праўду.

Мой заклік стварыць саюз прафесійных літаратараў прагучаў ці не дысанансам.

Дарэчы, Гілевіч не пацвердзіў, што пакідае шэрагі Саюзу, у якім заўладалі

здрайцы і звычайныя графаманы. А я спадзяваўся яго падтрымаць.

Шамякіны-савіцкія рассылалі па радах звароты да з'яднання са зграяю расійскіх

ультранацыяналістых (Бандарэнка, Бялоў), якія самапростам, без запрашэння

ўварваліся на беларускі з'езд з кіпамі сваіх газет і лістовак.

Сярод дня трывожная навіна — разгромленыя рэдакцыі беларускіх газет і

часопісаў: "ЛіМ", "Беларусь", "Полымя".

Выблядак пачаў карыстацца метадамі гестапа. Спачатку ноч выламаных

дзвярэй, а за ёю — ноч павальных аблаў.

Субота, 25 красавіка 1998 году.

8.30. Надвячоркам — Міраслаў з не менш адчайным і роспачным запытаннем: як

жыць і працаваць далей? Заставацца тут ці выехаць — хоць бы ў Польшчу? Я параіць

нічога не мог. Аднак сказаў: калі ёсць прадчуванне немінучага арышту, то трэба

ўцякаць.

Папраўдзе — пачынаецца ноч кінжальных нажоў.

У Беларусі вынішчаецца нават сама назва “беларус”. Тут, як нідзе, звілі сабе

гняздо ўсе расійскія камуна-фашыстоўскія саюзы. Сюды збеглася гнанае з Прыбалтыкі

маскоўскае гэбэ і энкавэдэ, усе шпегі і охранные доносители.

14.30. Гутарка з Валодзем: нам усім трэба думаць пра эміграцыю. Сітуацыя

вымагае. Жыць у бяспраўнай краіне немагчыма. Міраслаў, збіўшыся з толку,

прапанаваў Лондан. Валодзя — Вільню, я — Беласток. У Англіі — Чэсік. Што рабіць?

А мой, зрэшты, архіў, асабліва — дзённікі? А тастамент: пахаваць, рассыпаць попел на

варакомскім полі.

Чарнобыльскі шлях. Бел-чырвона-белыя сцягі над бясконцаю калонаю

маніфестантаў, што цячэ ў асветленай цясніне гарадской вуліцы. Дзеці з лампадкамі.

Расцяжныя жалобныя гукі звона. Ускрыкі: “Не-за-ле-жнасць! Не-за-ле-жнасць!” Інвалід

у калясцы.

П’яны з сівымі вусамі з тратуару ім наперакор: “Да здравствует СССР!”

Хлопчык гадоў сямі з пабітым тварам адпіхае п’янага дзеда.

Аўторак, 19 мая 1998 году.

9.10. Учора: выдавецтва, гутарка з дырэктарам, з новым рэдактарам (Шупенька).

Але ці выйдзе нарэшце кніжка, яшчэ невядома.

14.30. Гутарка з Валодзем перад кнігарняю “Падпісныя выданні” на праспекце.

У іх з Мірaславам дрэнныя справы: ліцэнзію на выдавецкую дзейнасць Камдрук не

выдае.

Потым сустрэча з Мірaславам каля ліфта — ён прыходзіў забіраць свае

дакументы. Якою вясельнаю зграяй нас, Адамчыкаў, акружыла каляпрэзідэнцкая і

калялітаратурная дружына.

Для сыноў паўстала пытанне: як выжыць?

16.20. Каб купіць што-небудзь з сабою на дачу (заўтра вязе на сваім джыпе

нявестка Таня), мусіў размяняць — і нарэшце абмяняць дваццаць даляраў. Каля аконца

абменнага пункту чарга на пакупку “зялёных”.

Дарэчы, як пачынаю заўважаць, знікаюць беларускія назвы харчовых прадуктаў

і з’яўляюцца сыр сусанінскі, каўбаса маскоўская, сыр волжскі. Між іншым, каўбаса

маскоўская вырабляецца на Ваўкавыскім мясакамбінаце, сыр сусанінскі — ці [не] на

Дзятлаўскім маслазаводзе (малачарні).

Серада, 27 мая 1998 году.

Сёння ў Доме літаратара, які ўжо па загадзе прэзідэнта зрабіўся корпусам № 5

оперупраўлення, засядае кнесет, ці вялікі хурал новай рады Саюзу пісьменнікаў.

Выбары чарговых сакратароў. Тут ужо нібы на даўнейшай палескай бяседзе,

калі ў хаце быў адзін стол, адна лава, адзін відэлец і адна чарка, што ішла па крузе,

нехта сядзеў за бяседным сталом, а нехта цярпліва чакаў сва<ёй> раты, тулячыся на

прызбе.

Сёння той-сёй, нарэшце выпакутаваўшы пэўны час, з прызбы пяройдзе ў хату за

бяседны стол. На покуць, зарослы павучынаю сплетняў, святы ўгоднік ужо пасаджаны

з’ездам літаратараў месяц назад.

Дзіўная, аднак, рэч: усе ганарыстыя кіраўнікі, што хадзілі задзёршы нос,

страціўшы пасаднае крэсла, раптам уцінаюць голаў у плечы і нябожацца, як свіныя

таткі.

Вось і сёння — адзін стары, згорблены, а калісьці з выпучанай грудзінай вядомы

фраер, нястомны бабнік, выбірае на камяністых сотках палявы шпат, раз за разам

наступае на лапату, другі, трохі маладзейшы, насунуўшы кепачку, ссутулена стаіць на

зялёнай мяжы і таксама раз за разам нагінаецца, выцікоўваючы на букеце што толькі
ўгледзелася бульбы каларадскіх жукоў.
18.45. Нарэшце выбрана кіраўніцтва суполкі бел. літаратараў: тры срулі і пры іх
Іпатава.
Чацвер, 28 мая 1998 году.
7.30. Як бы гэта не хадзіць у Саюз пісьменнікаў, ні з кім там не знацца і нікога
не бачыць.
Ад учарашняй рады я, кажучы ў рыфму, не рады. Адчуванне такое, нібы я нешта
ўкраў, некага аблаяў ці валяўся да непрытомнасці п'яным.
У сакратары <і літфонду> выбралі авантурыстаў і круцялёў. Пры чым яны да
нас, літаратараў, і мы да іх, злыдухоў.
Але ці палучу нарэшце ганарар, каб паехаць сёння на дачу. Другі месяц не
выплачваюць грошай.
"О, як трудна грош даецца!" — ці не так запісаў у сваім дзённіку Язэп
Драздовіч?
І яшчэ яго: "Усюдых фальш, манеўр, стратэгія на выйгрыш". Гэта нібы пра
новае кіраўніцтва суполкі літаратараў, якое будзе дзейнічаць пад эгідаю трох Б:
будзінаса, бядулі, бураўкіна. А пры іх тая ж кароценькая Іпатава, што змяніла, кажуць,
чацвёртага мужа. У свой гарэм чэмярыс Някляеў назбірае маладзенькіх паэтэсаў. Шлях
дзяўчатак, што забаўляюцца вершамі, на старонкі "Крыніцы" ляжыць праз ложа.
Чалавецтва, вядома, перажыло і горшыя часы (часіны), але сёння, як ніколі,
напладзілася даўганосікаў-цветаедаў, што амаль у кожнай кветачцы на беларускай
безабароннай яблыні яны вывелі чарвячка. Толькі і бачыш, як плаўна пагойдваюцца на
павучынах, раскалыханыя лёгкім ветрам, светла-зеленаватыя пярсцёначкі.
Брыджуся ісці ў Дом прэсы, каб не напаткаць там кароткага і тоўстага, як
свінабой, Ліпскага альбо такога выблядка, як Ягуда-Ягоўдзік.
Але трэба — безграшоўе змушае. Сёння нарэшце плацяць

ганарар.

Чацвер, 4 чэрвеня 1998 году.

Перачытваючы Кузьму Чорнага, бачыш, што беларуская проза на пачатку сваім

экспрэсіўнае, зіхатлівае і эфектнае слова шчодра і, як кажуць, па поўніцы чэрпала з

народнае гутаркі. Чым больш было прыгадана і ўжыта народных, а прынамсі і

дыялектных выразаў, параўнанняў, прымавак і прыказак, тым і больш беларускім,

уласна-праўдзівым рабілася апавяданне ці раман.

Цяпер проза вымагае іншых задач: не страціўшы слова з народных гаворак,

знайсці не менш экспрэсіўнае сваё. Стылізацыя пад народнасць паніжае ўзровень

прозы, як апрашчае яе да прымітыву літаратурна-газетны стыль, асабліва калі ісці

ўслед за моваю бел. газет, калькаванаю з расійскай — не дай Божа парушыць

інтэграцыю! — ненатуральнаю, немілагучнаю, іншы раз нават з адваротным сэнсам.

Гэтак калісьці нашкодзілі нам пераклады Леніна, уладна, па загадзе з непісьменных

вярхоў набліжаючы да арыгіналу, усякаючы і нявечачы бел. стылістыку, бел. пабудову

слоў і сказаў, яе рытм.

І тым не менш з Чорнаўскіх апавяданняў хочацца выпісаць — усё ж такі цягне

сваё, змалку чутае слова — некалькі забытых ужо выразаў:

Два браты — дзве натуры (характары)

Падтуліўшы плечы

Зыначыла ўсё жыццё

Зводдаляк

Цвёрдым крокам

Прыджгаў

Завіхаўся

Дзіўная рэч

Угрунтаваўся

Смутак, жальба

Зяленіва ядлаўцу

Заказваў на сход

Што мае да мяне?

Знаку няма

Ушчэнт разбіў

За чалавека не мелі (не лічылі)
Пляц
Паспрыяць
Як маецца?
Гадоў два таму
Цвеліцца
Абнямог
Вобмаль
Меркнуў дзень. Схмурнеў алешнік
Грэбля чарнела торпам
Звыклым парадкам
Наўпрасты (у Чорнага — напрамік)
Цярэспаля
Літасць
Замінацьме
Гаматны (вялікі) піджак
Як бачыш, насяку
Без жадных разваг
Леташняй зімою
Не зашкодзіць
Нястраўнасць
Дзень перагораць
Тры гады — вялікі час у чалавечым веку
Дубэльты ў вокны
Маладзік і сходныя дні
Панядзелак, 8 чэрвеня 1998 году.

16.45. Папраўдзе, панядзелак цяжкі дзень. У выдавецтве не прачытаны рэдактарам

(Шупенька) рукапіс (машынапісны тэкст) майго зборніка. У магазіне мяне аблічылі на

40 тыс. руб. У тэлефонным апараце забыўся размоўную картку. Са столі ў ванным пакоі

цячэ вада. “Куратнік, — смяяўся водаправодчык, зайшоўшы ў кватэру. — Хто зверху,

той…” У домакіраўніцтве (ЖЭС) быў непрыёмны дзень.

Словам, на сонцы за дзень добра напёкся, наштурхаўся ў задушлівых тралейбусах,

а карысці ніякай.

Балазе памаглі хлопцы, падкінуўшы на беднасць.

Серада, 1 ліпеня 1998 году.

7.00. Сёння ноччу запісаў на полі старога часопісу з дзённікамі Твардоўскага:

“Прачнуўся ў 2.30 ад невыносна моцнага галаўнога болю.

Шукаю таблеткі (клафелін і
берліпрыл)”.

Галава цяжкая і цяпер. У дадатак левы бок ніжай рэбраў працінае востры, як іголкі
ці лязо брытвы, падазроны агонь. Нырка, посік? Не разбяру, што баліць.

Хацеў паскардзіцца Ніне, але ёй ужо слова не скажы. Крыўдуе за кожную дробязь,
наракаючы на сваю старасць. А яна, старасць, і праўда ўжо чуецца і ў нашых бясконцых
хваробах, і [ў] недакладных рухах, калі ўсё падае з рук, і ў страце памяці, калі іншы раз
ідзеш, забываючыся, куды і па што ідзеш.

Сарваўшыся з электраправадоў, на чарэшню ў нашым двары злятае цэлая грумадка
пісклявых драздоў. Ягад на ёй ужо няма. Тую жменю, што яны яшчэ не падзяўблі, я
ўчора абабраў. Але ім напэўна помніцца, што (днямі) надоечы яны добра тут ласаваліся.

Пазаўчора іх апярэдзіла сойка. Яна сядзела на дрэве, не баючыся нават Нінінага крыку.

Рэч простая — кожная істота хоча жыць. А раз жыць, то і жывіцца.

Калісьці Жорж Сімэнон не мог гаварыць з Андрэ Жыдам пра яго кніжкі, бо
ніводнай з іх, апрача дзённікаў, да канца дачытаць не мог. А ўсё, як прызнаваўся
Сімэнон, праз яго стыль — занадта правільны і занадта элегантны.

Але ж і заскарузлы і зусім не элегантны, а хутчэй — абшарпаны і галеча-жабрачы
стыль нашых раманаў я не магу ўспрымаць. Душа вымагае дакладнасці, інтэлігентнасці,
элегантнасці, нарэшце, пісьменнай літаратурнай мовы, прасеянай хоць збольшага на
першае, негустое сіта ад русізмаў (урон), дыялектызмаў (ейны і ягоны) і ўсечаных
наркомаўкай ненатуральных слоў (зроблен).

Чацвер, 2 ліпеня 1998 году.

14.20. Патэлефанаваў у Мінск Ніне. І што ні дзень, то найгоршая навіна: Міраславу
не далі ліцэнзію на выдавецкую дзейнасць, Наташу выганяюць з працы ў Доме
літаратара. Не дзіва, што нашы кніжкі могуць скласці касцёр

на Круглым пляцы.

Бібліятэку ў суполцы літаратараў ліквідуюць. Там загаспадарылі тры невядомыя срулі

і кіргізка Іпатава. Ці ім да нацыянальнай беларускай культуры?

Рука сапраўды ўжо шукае гранату ці спуск у гранатамёце. І шкада, што іх у мяне

няма. А наўкруга — бандытызм, хабарніцтва, распуста, махлярства і здрадлівыя

лукашэнкі з малафейкінымі /…/

21.10. Як хвалюецца, як шапоча, як кіпіць раскалыханы і ўзбунтаваны ветрам наш

малады сад. Як шугае, густа шуміць, раскалыхвае з парыпваннем франтон (веранды)

мансарды парыўны вецер. Ён дзьме з-пад сівых, набрынялых дажджом, ацяжэлых

хмараў, што засцяць неба. Мільгае лямпачка, нібы папярэджваючы, што ноччу электрыкі

не будзе. Яна то прыгасае, свецячы толькі чырвонымі валаскамі, то ўспыхне ярчэй,

ператварыўшыся ў сонца…

Субота, 4 ліпеня 1998 году.

9.15. Учора дзікая гульба на праспекце: бубны, гармоні і электрагітары. Гурты

п’янай моладзі. З магазінаў прывезлі не толькі гарэлку, а чамусьці сантэхніку: ракавіны і

ўнітазы. Наш пад’езд заблакавалі скрынямі каньяку. Я нават паскардзіўся паліцэйскаму.

На кветніках пад ліпамі валяліся смяротна п’яныя мужчыны.

Сапраўды, пір у часе чумы.

10.30. Схадзіў на паштамт і палучыў нарэшце пенсію.

У свой пад’езд, сёння застаўлены скрынямі з двума busламі, прарваўся дзякуючы

міліцыянеру. Каб не ён, то алкашы з бурачковымі тварамі і наглыя дзявулі скрыні не

адсунулі б.

Нядзеля, 5 ліпеня 1998 году.

Учора — ізноў дзікая гульба. П’яная гурма ў сінім дыме ад шашлычных жароўняў

пад гукі ўзмацняльнікаў ляніва, як чэрві, варушылася на праспекце насупраць банку.

Ледзь не лопалі перапонкі, калі я прайшоў міма чорных скрыняў, з якіх выляталі

рытмы тамтамаў.

На пляцы Якуба Коласа не мог дачакацца тралейбуса — праспект быў заняты

шнурамі задыханых, спацелых бегуноў.

На крос выйшлі і дзяды, і ўнукі. Каб так на касьбу, ворыва і жніво.

Ніна ў касцёле. А ўкленчыць яна не можа — баляць калені.

Панядзелак, 6 ліпеня 1998 году.

7.30. Захмаранае, з ледзьве прыкметнымі ясна-блакітнымі (на гарызонце) і густа-

сіняватымі (у зеніце) азярынкамі, неба. Кружэнне бясконцае чорных вастракрылых

стрыжоў. Іржава-карычневыя дахі беднага, недагледжанага гораду. Гэта калі не зазірнуць

у брудныя засмечаныя двары з ямамі пабітага асфальту, засыпанага ружаватым

нязмеценым пяском. Старыя, ссутуленыя ад холаду кабеты, што вывелі на выгульванне

сабак, і зарослыя бародамі клышаногія бамжы, што цягнуцца да кантэйнераў са смеццем,

дадаюць душы яшчэ больш чорнасці і смутку.

Аўторак, 7 ліпеня 1998 году.

7.20. Непрадукцыйны я чалавек — трачу час на дробязі. Ужо гадзіну як капашуся ў

шуфлядах стала і тумбачкі, перабіраючы лякарствы.

Большасць (баляшыня, як казала маці) нашага жыцця ідзе на дробязі. Каб мы маглі

разлічыць кожны свой крок, колькі было б карысці.

Пятніца, 10 ліпеня 1998 году.

9.00. Учора нарэшце скончыў рэдагаваць і аддаў (хлопцам) сынам для набору сваю

“Развітальную аповесць”. Ёсць шмат (агульнага) адэкватнага паміж дзённікамі,

апавяданнямі і аповесцю.

Гэтыя паўторы варта было б зняць, ва ўсякім выпадку прыглушыць.

З офісу, куды я ледзьве падняўся пад вялікі дождж, сыны мяне запрасілі ў “Ракаўскі

бровар”. Гэта ўжо ў гонар Валодзевага ад’езду (на адпачынак) у Гішпанію.

Потым была яшчэ Міраслававa кватэра, нарэшце агляд іхняга новага офісу.

Трохпакаёвая кватэра, у якой толькі пастаўлены новыя сцены і ўсланы паркет, мне

спадабалася, але ж першы паверх…

Абыдзецца яна дарагавата.

Дарэчы, у ёй ужо ўстаўлены новыя вокны (пакеты), няма толькі дзвярэй.

Нядзеля, 12 ліпеня 1998 году.

У старожцы, хватаючы слухаўку — тэлефоны спараныя, — не даюць пагаварыць

бамжы, якіх тут пасяліў, узяўшы за старажоў, ранейшы старшыня таварыства. Я адчыніў

дзверы старожкі і ўбачыў на калодцы п'яную маладзіцу, яна нешта барматала ў чорную

тэлефонную трубку.

І машыны да іх прыязджаюць пад № /…/ КХ і /…/ МХ. Значыць, тут збіраецца цэлая

зграя зладзеяў, што абіраюць дачы.

Панядзелак, 13 ліпеня 1998 году.

Кручаны

— Бог назваў святло днём, цемру — ноччу. А як мне назваць сабачку? Я купіла яго

без імені. Ішла на рынак па іншай патрэбе, і ў пераходзе метро стаяла жанчына,

трымаючы на руцэ, сагнутай у локці, лапавухае шчанятка з выпуклымі і неразумна-

наіўнымі вачамі. Я мінула гэтую худую, высокую, як жардзіна, жанчыну, з гарбаватым

носам і тонкімі губамі, а ў памяці засталося шакаладнага колеру чорна-сінявокае шчаня.

Я, вядома, вярнулася.

А шчаня аднойчы згубілася і прывяло ў кватэру чорнага, як асмалак, і гэтакага

жылістага, кручанага, як асмалак, Тодара.

Аўторак, 14 ліпеня 1998 году.

Гул, грукат і вуркат самалёта, што глухне за ўздыбленым гарбом лесу, затканага

сіняватаю смугою, нясе мае ўспаміны на надрэчныя алешыны і вербы Варакомшчыны, да

даўняга, можа, дваццацігадовага лопату верталёта, што чамусьці лятаў над далінаю

Ятранкі, да тых людзей, якіх ужо няма, якія спяць пад глыбамі пяску сярод марных,

чэзлых і замшэлых хвоек. І чамусьці ў галаве пайшоў такі падлік: каму было дзесяць —

сёння яму трыццаць, каму было трыццаць — сёння пяцьдзесят, каму пяцьдзесят — таму

сёння семдзесят, каму семдзесят — той адышоў.

А верталёт, трымаючыся за празрысты круг прапелера і падняўшы хвішчаваты

хвост, усё лапоча над зялёным алешнікам і сінявата-сталёвым рваным паскам Ятранкі. І

густа стаіць сівáваты, ацяжэлы ад расы авёс на гарбатых боханах далёкіх і блізкіх грудоў.

Палявыя межы і дарогі горка і вязка пахнуць белым рамонкам, упрыгожаным лёгкімі,

сінімі, як матылькі, валошкамі…

Серада, 15 ліпеня 1998 году.

9.00. Адстаяў, ці, праўдзівей, прагаварыў чаргу па малако з ліпкім Спрынчаном. І

заварыў сабе манную кашу. Чакаю Ніну. Але наўрад пад марасісты дождж, што крадком

пасыпаў і разышоўся, пабольшаў, яна прыедзе.

Надвячоркам разгортваў Брыля, але чытаць яго куртаценькія, кволыя, націнныя

апавяданні не мог. У свой час, працуючы ў “Мінскай газеце”, іх, напэўна, адрэдагаваў

Антон Адамовіч. Бо тое, што было ім выбракавана, выпраўлена і надрукавана ў той жа

газеце — цыкл дзіцячых навелак, — выдатна.

Чацвер, 16 ліпеня 1998 году.

Прыгадалася мая астатняя сустрэча, праўдзівей, гутарка па тэлефоне з Кандратам

Крапівою, ці, па-нашаму ды, можа, і па-ўздзенскаму, — Крапівом. Блізілася яго 90-

годдзе. Але пра гэта трохі ніжэй…

З ім, ужо даволі сталым, хворым на вочы (катаракта), я сустракаўся і гутарыў не

раз. Як памятка пра гэтыя кароткія сустрэчы застаўся блакітны, пасярэбраны на карашку

пяцітомнік з тым няроўным дарчым подпісам, які яму, невідушчаму, даўся даволі цяжка.

Ён доўга і навобмацак, адцягнуўшы сярэднюю шуфляду стала, шукаў стрыжань:

— Недзе ж тут.

Я прапанаваў сваю аўтаручку.

— Дзякую. Знайду. Павінен быць, — яго доўгія пальцы таропка кешкаліся на

днішчы шуфляды і нарэшце знайшлі белую кантовую ручку, прымітыўна-простую,

шарыкавую.

Ён ганарыста падняў свой старэчы, хударлявы, перакрэслены

зморшчынамі, але
яшчэ ружаваты твар і, зморшчыўшы нос і прыўзняўшы (закапыліўшы) верхнюю губу, як
гэта робяць падслепаватыя людзі, пераможна паглядзеў на мяне. Вядома, праз складаныя
лінзы акуляраў. Не ведаю, ці ўбачыў ён мой твар, бо доўга, на вобмацак, пэўна, ішоў
адчыняць дзверы, накінуўшы на плечы ці не байкавы бальнічны халат, як гэтак жа,
абапіраючыся растапыранаю рукою аб сцяну, вяртаўся ў свой кабінет з калодаю
вычасанага красналюдка ці лесавіка і стэлажамі беларускіх кніжак, асобна ад расійскіх,
якія стаялі злева і ў цэнтры, нібы намёк на інтэграцыю.
— Чытаю ваш раман. Толькі ўжо зрок слабы — губляю радкі. Ого, колькі вы
ведаеце зёлак. Але ў адным месцы ўсё ж паўтарыліся.
Ён быў карэктны, а можа, трохі афіцыйны. Але помніцца, калі з нагоды залатое
зоркі мы сфатаграфавалі яго на лаўцы ў акадэмічным садзе ў сівым старамодным
капелюшы і збіраліся былі развітацца, ён нечакана запрасіў да сябе на кватэру.
Мне было няёмка і сорамна, і я знайшоў адчэпку:
— У грыбы сабраўся.
— Ідзі, пасядзі за сталом, грыбы падрастуць, — ён, падняўшы абедзвюма рукамі
і пераклнуўшы за борт сваю правую нагу, пачаў паволі выбірацца з машыны.
І перад гэтым таксама жартаваў, учуўшы, як на зялёнай выспе сярод нерухомага
азярка гарланіць певень.
— Во, чуеце, спявае.
— А што, тут і пеўні ёсць? — здзівіўся наш шафёр.
— Усяго адзін. А курыцу на лодцы яму не падвезлі, таму і крычыць.
Астатняя ж наша гутарка аказалася не толькі не жартаўлівай, а нейкай адчужана-
невясёлай, калі не сказаць горкай. Патэлефанаваўшы Крапіве — дзякуй Богу, слых у яго,
як і памяць, быў яшчэ не скарэжаны старасцю, — я папрасіў яго, папярэдне, вядома,
распытаўшы пра здароўе, напісаць зварот да моладзі: часопіс “Бярозка”, дзе я працаваў

тады на пасадзе рэдактара, меўся прысвяціць яму некалькі сваіх сціплых разгорткаў

(развароtаў).

Але ў слухаўцы зацягнулася падазронае маўчанне, патрэсквала разрадамі толькі

правадная адлегласць, дарэчы, кароткая — наўскос праз праспект — ад Дому друку, дзе

знаходзілася рэдакцыя часопісу, да магазіну “Сінтэтыка”, над якім ён жыў.

Нарэшце пачуўся яго слабы і ўжо даволі глухаваты голас. Мяне кінула ў

недаўменне яго кароткая, трохі нават асцярожная, але катэгарычная фраза:

— Тут ёсць нюанс.

— А ў чым справа, Кандрат Кандратавіч? Танк, напрыклад, у свае семдзесят нам

напісаў.

— У семдзесят можна, а ў дзевяноста…

І раптам нечакана страшнае і крыўднае, напэўна, да болю ў скронях, раздражнёнае

запытанне:

— Хіба вы жадаеце мне смерці, што вымагаеце гэты зварот ці запавет?

Я, мусіць, таксама доўга маўчаў, пераводзячы дых.

Было, вядома, і маё прабачэнне і за трывогу, і за тэлефонны званок, і за сваю,

мусіць, неабдуманую прапанову і некарэктнасць.

— Даруйце яшчэ раз, — нарэшце я змогся ў сваёй мальбе і просьбе.

— Нічога, бывае, — адклікнуўся ён, як мне здалося, паспакайнелым, а ўсё ж

пакрыўджаным, недаравальным тонам у голасе.

З гадамі, успамінаючы гэты выпадак, я чую нейкую невымоўна цяжкую,

незразумелую і невытлумачальную віну перад Кандратам Крапівою. Але ў чым яна,

дабраць і асэнсаваць не магу.

Што ён, як казаў Дастаеўскі пра Пушкіна, забраў з сабою нейкую вялікую таямніцу,

то, мусіць, не. Крыўду, то, напэўна, так. Але ж пражыў нямала — 94 ці 96. То ў чым жа

яна?

Пятніца, 17 ліпеня 1998 году.

Мой самаробны флюгер, мільгаючы срэбна-бляшаным

прапелерам, паварочваецца
на поўнач.
Гнуцца ўстрывожана-непакорныя, раскалыханыя ветрам, маладыя танканогія
яблынькі-прышчэпы, і на сетку доўгімі сівымі косамі, нібы ў актыніі, навальваецца
вербалоз.
Неба спрэс сівае, з дымам ірваных цемнаватых хмар, што сплываюць за цёмна-
зялёны гай. Адна да аднае ў знямозе ці ў жалобе туляцца, нагадваючы нечым усходніх
жанчын, затуленых чадрою, гнуткія бярэзіны. Сівыя дымкі ад нізкіх хмар перапаўзаюць
высокую спіну шмат'яруснуга лесу.
За акном пад застрэшкам франтону гудзе і віхрыць вецер.
Субота, 18 ліпеня 1998 году.
7.00. Прачнуўся пад гул, шэпт і падвыванне віхурнага ветру, ад якога парывала
і стагнала мансарда. Як вынік гэтых парываў — недзе зблытаныя электраправады —
святла няма.
Сад трапеча, кіпіць, варушыцца, гнецца доўгімі маладымі галінамі ледзьве не да
зямлі.
Сівыя воблакі рваных хмараў, пераплыўшы праз зубчаты хрыбет лесу, спадаюць у
лагчыну.
Дуб, падняўшы круглую крону, нібы амёба шчупальцамі, варушыць ёю, плыве
супраць ветру.
І вал за валам сіва-дымных нізкіх хмараў коціцца за прылізаны, нібы павернуты
спінаю да ветру, ссутулены гай. Успомніўся гэтак захмараны, дажджлівы і ветраны май,
калі я, прыехаўшы ў Варакомшчыну, хадзіў на поле, дзе была Папушчына, сасновы лес,
высечаны калгасам (старшыня — антыхрыст Каско), шукаць сунічнік, праўдзівей — яго
кветкі. Каля каменняў, нассованых з поля, каля іхніх лежбішчаў, што нагадвалі
прыморскія лежбішчы маржоў, нага наступіла на сухія сасновыя шышкі. Я ажно
зніякавеў і падняў іх як прыкмету, як знак, што некалі тут шугалі і ўздымаліся да неба

стрункія сосны.

Наўкруга на боханістых грудах ляжала лілова-карычневая ралля з кволымі

жаўтлява-зялёнымі ўсходамі ячменю ці аўса. І душу высмоктваў смутак, і сэрца сціскала

жальба, што ўсё мілае і знаёмае змалку — зацішная сцяна хвоек з падлескам крушыны,

берасклету і цёмна-зялёных купчастых елачак з чырвоным агнём і лопатам цецерукоў —

так беззваротна адышло.

Быў лес, прытулак… А цяпер я стаяў нібы расхрыстаны ці бессаромна голы сярод

голага, бязлесага і нібы чужога поля. О, як гэта цяжка: хаваць не толькі чалавека, але і

родны лес, што прыветна цягнуў да цябе выгнутыя галіны з ёршыкамі зялёных ігліц і

лашчыў душу мяккім цёплым шэптам.

Які бязбожны, нечысцівы і шкодны чалавек, бывае, народзіцца на зямлі.

Субота, 18 ліпеня 1998 году.

15.00. Парывісты вецер (заходні ці нават заходне-ўсходні), перагонамі дождж, як у

глыбокую восень. Дзень схіліўся на вечар, а сонца яшчэ і не прабілася праз тоўшчу сіва-

белаватых хмар. І Ніна мусіць расіцца ў мокрых кустах, каб назбіраць вядзерца парэчак.

Дачнікі паціхеньку ўцякаюць у горад. Балазе з’явілася электрыка, а то і мы, як

кажуць, навастрылі лыжы. Паедзем заўтра.

Няўжо ж не распагодзіцца?

Праз авёс, вядома ж мокры, з пустымі кашамі, бо памахвае імі, прэцца на дачы

грыбнік. Апрача баравікоў, лісіц, асавікоў і падбярозавікаў высыпалі ўжо апенкі —

асеннія грыбы. І сіўцоў (ваўчакоў) поўна.

Грузавік гудзе. Мусіць, нейкая “Татра” ці “МАЗ”, што з жвіровішча пад Заслаўем

(бяруць) возяць пясок.

Нядзеля, 19 ліпеня 1998 году.

7.15. Пагодны, ветраны ранак. Але на ясна-блакітнае неба наплываюць кудзеркі

белых хмарак. Адна за адною. А на небасхіле белая рабізна іх.

Мігціць осцямі, выпусціўшы колас, жаўтлява-зялёны ячмень пад кучарава-зялёным

дубам. Па загонах бульбы засвяціліся пяцікутна сонечна-
жоўтыя кветкі гарбузоў.

Ніна ў гародзе з пучком цыбулі (пер'я). Збіраемся ў Мінск, нарыхтаваўшы ў дарогу

па вядзерку чырвоных і чорных парэчак (смародніку).

Серада, 22 ліпеня 1998 году.

18.50. На градусніку +30 °С. Але ён на сонечным баку і нагрэўся за дзень. Усё ж на

праспект не высунуцца — ідзеш як па Афрыцы і цябе прыціскае да асфальту.

Вярнуўшыся з Масквы, заходзіў Міраслаў. Заўтра ці паслязаўтра ён прынясе

карэктуру "Развітальнай аповесці", майго зборніка прозы.

Учора, сустрэўшы Сашу Станюту ў аптэцы, я падмовіў яго купіць маці, вядома, за

мае, бутэльку до пурпара (мал. віно).

Спадарыня Стэфанія, напэўна, была бясконца рада. Бо хто ж успомніць пра

шаноўных людзей, калі не я.

Аўторак, 28 ліпеня 1998 году.

Цікавае апісанне кветак у польскіх даведніках. Напрыклад, у кнізе "Пажыткі пчол".

Пра кіпрэй, ці па-расійску іван-чай, у нас — кудзеля, гаворыцца простаю, нават трохі

паэтычнаю моваю: цвіце ў ліпені і жніўні. Кветкі велікаватыя, кармінавыя, сабраныя [ў]

стажковую гронку.

А пра цвет мядункі: найперш чырвона-ружова, а пазней — блакітна, нябеска. Расце

пераважна ў лесе. Цвіце ад пачатку сакавіка да пачатку мая. 30 см вышыні.

Медуніцу ў нас называюць смактухаю, па-расійску — медуніца цёмная.

Мацяжанка. Ці не <мыцердушка>? Выдае араматычны пах. Кветкі ружова-ліловыя.

Нарэшце здагадаўся — ліловы, поўны пчол наш чабор. Гаркаваты, цёпла-густы яго пах

заводзіць у роце. Ён заўсёды поруч з жоўтым расходнікам. Гэтымі жоўта-ліловымі

стракатымі дыванамі былі ўсланы нашы сухія ялавіны ці пералогі. Яшчэ між іх сівавата-

варсістыя, але мяккія лісцем, стрымбулі жоўтай ад кветак мядова-пахучай дзіванны, а

ўвосень, калі згасне дыван, на ім закалышуцца, махаючы сіваліловымі галоўкамі-

шышкамі, сціплыя, сарамлівыя каткі.

У суботу, калі мы са сватам ехалі на дачу і з дачы на яго шарым, ужо стараватым

“мерседэсе”, нас на адхонах шашы віталі сінія, праўдзівей, блакітныя лёгкія матылькі,

толькі не ўзляталі, — кветкі мацаўніку (цыкорыі), што абляпілі яго ледзьве не голыя

бадылі.

Па-восеньску ўжо суха шапаціць, калышацца і сыпле першае жоўтае і пажухлае,

дзіравае лісце наш яшчэ не стары садок. Але ўжо з чэзлымі ад марозу і раку замшэлымі

яблынямі. Дрэвы гінуць цераз адно.

Неба замурзалася валакністай рэддзю белаватых высокіх воблакаў. Кіпіць,

варушыць кожнаю галінаю круглаверхі дуб.

За блакітна-сіваватай капустай, за жоўтымі ад цвету патысонамі ці кабачкамі

гнуцца зялёныя высокія зараснікі тапінамбуру (земляное грушы, ці канадскай бульбы).

Ён яшчэ не цвіце.

Серада, 29 ліпеня 1998 году.

7.30. Вяртаючыся ў падлеткавыя гады (ажно страх казаць — паўвека назад),

перачытваў пад шапаткі вечаровы дождж спіленькую ружавата-злінялую кніжачку

Змітрака Бядулі з тымі змалку вядомымі яго апавяданнямі “Пяць лыжак заціркі”, “Малыя

дрывасекі”, “Летапісцы”, “Віхор”.

Наіўна-замілаваная, простая проза, якая так прыйшлася даспадобы маладой душы,

сёння трохі выклікае не злы, добры смяшок.

Найлепш напісана, нягледзячы на арнаментальнасць і часам літаратурныя шкляныя

званочкі, навела “Віхор”. Добра, даверліва ўспрымаеш і гэты паўтор з ледзь улоўным

тонам у голасе местачковага балагола: “Ах ты-ы-ый… Баламут! І-ха-ха”. І чуеш гэты

тоненькі і дробны смех, і бачыш, як дзедава дрыготкая шурпатая рука гладзіць

аксамітную шыю свайго гадунца. І нават уяўляеш, як сівыя

мяккія губы жарабка бяруць з

дзедавай далоні чорствы хлеб.

Каб не наіўная, занадта ўжо фантастычная канцоўка — жарабок прывозіць на сабе

свайго злодзея, беспрытомнага канакрада, што “бразнуўся лбом аб хвою” і чамусьці не

зваліўся, ушчаперыўся пальцамі ў гарачую густую грыву, — навела была б беспадобнай,

проста зіхатлівай іскрынкай нашай, не такой ужо і багатай на класічныя шэдэўры,

нацыянальнай прозы.

Пятніца, 31 ліпеня 1998 году.

Дзіва, але Міцкевіч у эпілогу “Пана Тадэвуша” Навагрудчыну/ Польшчу называе

“краем шчаслівым, убогім і цесным”.

“Ptak malego lotu”.

Выраз Міцкевіча: “Павінна і там быць жыццё, дзе маскаль тне сякераю”.

Субота, 1 жніўня 1998 году.

Праз тыдні два будзе пяты год/якраз роўна пяць гадоў, як мой малодшы брат Янак

не чуе ні плачу за сцяною ўнука, ні вадаспаднага ліўню за акном, ні пошуму старых дрэў

у блізкім парку, ні рыкання кароў у цаглянай пабеленай аборы, ні лопату блакітнага

калёснага трактара на вуліцы і не прыедзе да мяне, каб убачыць у росным садку

паружавелы зялёны яблык на абвіслай галіне той яблынькі-прышчэпкі, якую ён калісьці

прывёз з Пружаншчыны, дзе спачывае сам недалёка ад старой бярозы з зажуранаю

сасною, і якую, выкапаўшы ямку, пасадзіў мне на ўспамін.

У аўторак 17 жніўня 1993 года на лістку адрыўнога календара я запісаў няроўным,

нервова-дрыготкім почыркам: “Сёння, у 5.30 раніцы, памёр мой брат — Ян Адамчык”.

Недзе ў шэсць пасля навальнічнага дажджу мне з Каштанаўкі (былы панскі двор

пад Пружанамі) патэлефанавала Аня, яго жонка, сказаўшы каротка: “Памёр Іван. Вось

толькі што. Уключыў святло і паклікаў мяне з мацераю: “Будзьце пры мне, не

адыходзьця!” Мы запалілі свечку. Ён заплюшчыў вочы — і памёр”.

Нядзеля, 2 жніўня 1998 году.

Не мог прысесці за стол, успомніўшы Яна, яго заўчасную, у 49 гадоў, пакутную

смерць.

У гэтакія парныя ліпеньска-жнівеньскія дні я наведаў яго яшчэ жывога, схуднелага,

як Хрыстос, з вялікімі ўмольна-вінаватымі вачамі. Колькі было наіўнай просьбы ў гэтых

дзіцячых сіняватых вачах, калі мы развітваліся.

А перад гэтым была задушлівая ноч з перуном, водгуллем грому, шчодраю

навальніцаю і яго сухім, раз за разам, нямоцным кашлем за перагародкаю…

Дарога дадому/да чыгуначнай станцыі праз залатое ўжо збожжа — палавое жыта і

бурштынавыя аўсы — у кабіне жоўтага малакавоза ад белай фермы поруч [з]

двухпавярховым сілікатным домам з ражнамі і крыжавінамі антэн на шыферным даху і…

акном у ім, завешаным белымі фіранкамі, у тыльным пакойчыку з пластмасавым

прыёмнікам на падлозе пры ложку, на якім, я ўжо ведаў, ён застаўся дажываць апошнія

дні.

І мне на калдобістай палявой дарозе помніліся вялікія сіняватыя вочы ў кучаравых

густых вейках і акно, зашморгнутае белымі фіранкамі…

Панядзелак, 3 жніўня 1998 году.

7.20. Нарэшце можна жыць — у кранах з’явілася гарачая вада. Праўда, рыжавая,

як з гнілога балота.

Мой абсяг, як у дыпламата ці прадстаўніка місіі ААН, абмежаваны радыусам у

25 км, і выйсці за гэты круг сёлета мне не ўдалося: горад — дача, дача — горад.

Як хацелася б узляцець на пагоркі, каб убачыць панараму знаёмых палёў з

жоўтым, бурштынавым аўсом і запалавелым, шархотка-чуйным жытам, што чакае

сярпа. Як зманвае затравелая сцежка пад старымі алешынамі і вербамі, што бяжыць

крутым берагам над крынічнаю, сцюдзёнаю Ятранкаю.

Я так знябыўся па родным варакомскім кутку. А ён усё

аддаляецца ад мяне і ўсё

чужэе, зарастаючы новым лесам, дрэвамі, забудоўваючыся новымі хатамі, у якіх ужо

гаспадараць свежыя людзі, як называлі ў нас чужога і новага чалавека.

Панядзелак, 10 жніўня 1998 году.

Отшельник. Як перакласці? Пустэльнік? Валацуга? Бадзяга? Цяняецца. Цянетнік?

18.00. Як гнецца ў струнким трыццацігадовым сасновым падлеску большая ў ім і

адзінокая бярэзіна. Тонкія, годныя толькі, можа, на латы ці кроквы сосны калышуцца

ўсе разам, як, падняўшыся, балельшчыкі на футбольным стадыёне.

Сярод мройна-трапяткіх бярэзінаў пакалыхваецца і ўпартая елка, але зрэдку, пад

большыя парывы ветру.

Адліваючы шоўкам, калышацца, ходзіць хвалямі, як разасланае палотнішча, нізкі

ячмень.

На залацістым прыцямнелым аўсе хваляў не відаць, толькі ледзьве прыкметнае

мройнае калыханне.

Мужчына, трымаючы ў руцэ складное крэсла, выйшаў з лесу, а за ім выбегла

чародка чорных і белых коз.

Вецер нясе сівыя пухкія шарыкі асоту. Над гаем уздымаюцца ластаўкі,

дачакаўшыся нарэшце сонца. Дождж перагонамі, ветраны надвячорак нагадваюць пра

блізкую ўжо восень. Прыгадалася бабка Магдалена з палачкаю: “Як хмарка набяжыць,

так і дожджык”.

Аўторак, 11 жніўня 1998 году.

Каля сотак з сівавата-зялёнаю лапушыстаю капустаю і пажоўклаю бульбаю

паходжвае, насунуўшы на лоб кепачку, прыгорблены, як свіны татка, былы кіраўнік

звязку літаратараў. У руцэ яго ўжо кіёк пенсіянера, а каля ног — калматы з белаю

грываю колі, вартаўнік дачы.

Наша памылка ў тым, што смерць мы бачым толькі (лишь) перад сабою, а яна ж

значнаю сваёю часцінаю — ужо ззаду. Тое, што мы перажылі,

— ужо ёсць набытак.

Серада, 12 жніўня 1998 году.

9.00. Месяц, як купал белага парашута, на светла-блакітным небе між двума

дубамі. Сухі, але трохі сцюдзёны вецер з поўначы, з нашага азярца.

Калыханне, як шоўку, спалавелага ячменю. Залацісты авёс укрыў гарбаты грудок

перад зялёным, нібы ўспененым лесам з зубкамі крыжаватых елак, над якім завісла

(усплыла) першая белая пеністая хмарка. Трапяткі, раскалыханы ветрам сад.

Гарыць, адчуўшы сонца і раскалыхаўшы разеткі кветак, аранжавы кракос.

Цяжкі, непатрэбны ў гэтым мілым, прытомленым ранку гул самалёта.

У гародах з-пад шурпатага і вялікага, як паднос, лісця ўжо вызіраюць доўгія, нібы

парасяты, паласатыя гарбузы.

Ноччу — бясконцыя хваробы: галава, жывот, сэрца. Страшныя сны, ад якіх раз за

разам прачынаўся і шукаў таблеткі. Але яны не ратавалі.

Дзённікі Караткевіча, знойдзеныя ў стосе вырваных часопісных лістоў, наіўныя,

нібы ў школьніка, з доляй нейкага фантазёрства: “…пісаў ліст у ААН. Сёння Адамчык

забраў яго”.

Помніцца, ён аднойчы сказаў мне, калі дачуўся, што я паеду ў Нью-Ёрк на

XXXVIII сесію Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў: “Я напішу заяву на імя старшыні. Ты

перадасі яе?”

“Перадам”, — сказаў я.

Але заявы я ўсё ж не дачакаўся і перад ад’ездам, у пачатку верасня, зайшоў да яго

ў кватэру.

“Я перадумаў. Іншым разам…” — зніякавела і нават трохі збянтэжана адказаў ён.

Але гэта было ў 1983 годзе. Чаму гутарка ідзе ў 1982 годзе, мне не зразумела. Хто

пераблытаў — публікатары ці сам Караткевіч? І ці быў, зрэшты, напісаны той ліст?

Як і астатняя частка “Каласоў”, пра якую не раз, асабліва пад чарку, гаварылася:

“Нарэшце бяруся за “Каласы”.

Але здароўя, творчай моцы на іх ужо не засталося.

З яго біла, бурліла [срэбным] фантанам дзіцячая выдумка, [уздымала перлавым]

наіўная фантазія. Ён, як дзіця, любіў неверагоднае: “Ты ведаеш, Чэсь, учора мы ездзілі

ў Налібакі па грыбы. На лясной дарозе натрапілі на асінае гняздо. Яно так узарвалася,

што задняе аўтобуснае кола разляцелася ўшчэнт”.

“Ну, Валодзя, як ты і жывы застаўся пасля хірасімскага ўзрыву асовага/асінага

гнязда”, — засмяяўся я.

“Ты ксёндз, ты адносішся да ўсяго з недаверам”.

І [як] кожны раз, закрыўдаваў. Я заўсёды падсміхваўся з яго гіпербалічных

неверагодных параўнанняў і выдумак: “сабака быў вялікі, як Брыль”, “Пшыркоў — гэта

ж прыгонны майго дзеда”, “Ты ж не ведаеш, колькі па свеце раскідана маіх дзяцей.

Дачку пара ўжо выдаваць замуж”.

16.00. Фуркоча мой самаробны флюгер. Паварочваецца з захаду на поўнач.

Ранкам раіліся вершы:

Двор глухі —

Крапіва, малачай.

Ад тугі —

Пераспелы адчай

Сноп тугі

На іржышчы чужым

Абцугі

Дум і слёзак іржы.

Валасы

Тонкай лёскай блішчаць <ірдзяць>.

Каласы… <Галасы>

Ацяжэлі, каб жаць

<Пад сярпом ляжаць>.

Чацвер, 13 жніўня 1998 году.

9.30. У чыстым сіняватым і глыбінным, як акіян, небе — адзінокі парашут —

палавінка месяца. Павярнуўшыся бела-празрыстым купалам да сонца, ён плыве,

зніжаецца на захад.

А цяпер завіс над жоўта-залацістым аўсом і дальшым, прасвечаным у круглай

кроне, прысадзістым, таўстаногім дубам.

Пасля светлай, з палавіны, месячнай ночы з вялікім і калючым ліхтаром Венеры,

што ўзышла на ўсходзе адразу ж пасля заходу сонца, — росны, азыраваты ранак. +9 °С.

Не болей. Бо на мансардзе, дзе сплю, ноччу з-пад коўдры руку ці нагу высунуць было

няможна — холад.

Прачынаючыся, перачытваў дзённік Глебкі з часу вайны. Калі аб'ектыўна

ацэньваць, то больш праўдзівейшы, чым Танкаў. А ўслед за ім — запалітызаваныя,

паўфальшывыя запісы з фронту Фадзеева. Чытаючы апошняга, ужо горка думалася: як

усю праўду жыцця, пачуцці, развагі прыгнятаў шматтонны чыгунны сталінізм.

Пісьменнік ператвараўся ў холадна-жорсткага камісара, рука якога трымала не пяро, а

халодны, гатовы пырснуць куляй кожнаму ў твар, дрыготкі пісталет.

<…> 1934 год. Жылуновіч піша з Ленінграду:

"Я пісаў па-беларуску, і гэта зманіла мяне да супрацоўніцтва ў "Нашай ніве", у

якой супрацоўнічалі, як пазней даведаўся, нацыяналістычныя элементы — цяперашнія

нацыянал-фашысты і шпіёны дэфензівы на сродкі польскіх магнатаў…"

Цытаваць страшна, крыўдна, непамысна.

Ружовыя ці малочна-бурачковыя (гаштры) флёксы пахнуць густа-саладжавым

цяплом нябожчыка. Цвіркат, нібы развітальны, белагрудых ластаўкаў. Гудзе, вуркоча,

прападаючы, самалёт, і з дачнага блочнага, падобнага да хлява, дому б'е ў перапонкі

ўзмацняльнік, даносячы тамтамы ўдарніка. Там усё шалее шпана, што збудавала шалаш

у бярозавым гаі і сярод ночы пад вогнішча пастрэльвае нейкімі ўзрывальнікамі.

Кажуць, што гэта ўнукі (байструкі) Клаўдзіі Лукашэвіч.

Пятніца, 14 жніўня 1998 году.

9.20. З шасці і да паловы дзевятай у чарзе і гутарцы з жанчынамі. Затое ўзяў два

трохлітровыя слоікі малака. Яно цёплае, нібы ранішняга надою. Але, кажуць,

перагнанае праз сепаратар, а потым ужо трохі разбаўленае вяршком. Фермер, як бачу,

хітраваты, таму і сыценькі дзядзька.

Ноччу, як заўсёды, зноў пакража: з таварыства сувязістаў прыходзіў малады, як

мне падалося, трохі на падпітку, коратка стрыжаны мужчына, грозячыся пабіць усіх

падлеткаў. Жанчыны паказалі яму на будан, які збудавала ў гаі басатва і дзе яна

збіраецца нанач.

А на тутэйшых сотках пакопана бульба. Ад зладзеяў не ўратавацца.

Мякка ўспырхваючы нават ад варонінага каркання, вакол азярца кружыць

шаравата-чорная грамадка шпакоў. А каля іх — дразды, пеначкі, сітаўкі ўюцца.

Чапля з тонкаю цэвачкаю хваста, махаючы скобкамі шырокіх крылляў, ляціць над

нашым домам.

Свіргатліва пацвірквaючы, грумадкаю — ажно дзевяць — над дачнымі садкамі і

пацямнелымі шыфернымі дахамі імкліва лётаюць чырвана(кармінава)грудыя

канаплянкі.

Знак восені — усё птаства ўжо сабралася ў чародкі.

Аднак тыдзень назад мухалоўка прывяла ў наш сад сівенькіх, толькі што

апераных, жаўтаротых пташанятак.

Сінявата-сівае замурзанае неба — на змену надвор'я ў мяне несціханы боль ў

скронях. Трэба шукаць таблетку цытрамону.

13.40. Пачаў церушыць дробны, невідушчы (невідочны) дождж і, покуль я

палуднаваў, абрасіў часнок і цыбулю, якія я ў місах выставіў на вецер. Вось так

падсушыў.

Лес, лагчына за аўсом — усё ў імжы, у тумане. Адкінуцца расці грыбы. Толькі дзе

мне іх збіраць — так далёка варакомскія пералескі — маладыя, пасаджаныя гадоў 25

таму хвойнікі. А ў старых замшэлых Пясках і Маргах так шмат прысадзістых

карычневых баравікоў, асабліва па сівым чуйна-мяккім імху.

Дождж нібы суцішыў боль галавы, але ці надоўга?

5-ы, яшчэ выданне “Бібліятэкі “Аганька”, светла-блакітны, у лідэрынавай

вокладцы, том Уладзіміра Караленкі. Шчыры, больш даверлівы і, вядома ж, больш

інтэлігентны, чым, напрыклад, набокаўскі, артыкул такога ж самага ўкраінца ў

расійскай літаратуры пра свайго папярэдніка і (земляка) суродзіча Мікалая Гогаля.

Цікавая, можа, знаёмая дэталь: у Расіі ўсё ці ўсе служылі: Дзяржавін быў

губернатарам, Карамзін і Жукоўскі — царадворцамі, нават Пушкін не мог скінуць

прыдворны мундзір і адышоў у магілу камер-юнкерам. Толькі Гогаль застаўся толькі

Гогалем і нічым болей. Толькі пісьменнікам.

Услед за Гогалем пісьменнікі служылі толькі літаратуры: Тургенеў, Дастаеўскі,

Талстой. Таму і быў яе залаты век.

Сталін вярнуў скасаваны ў літаратуры прыгон. Пісьменнікі пачалі служыць зноў

— то губернатарамі (сакратарамі абкомаў), то царадворцамі (членамі ЦК). Ды член

Саюза пісьменнікаў — гэта ўжо служба на карысць цара і дзяржавы.

Гогалеўскую “тяжкую, мучительную печаль” я перажыў у 1963 годзе,

адпачываючы ў Гаграх, а потым, восенню ўжо, на Вышэйшых літаратурных курсах у

Маскве. З жахам успамінаю гэтыя дні, 218 і 273 нумары пакояў у інтэрнаце на вуліцы

Дабралюбава, дзе я жыў.

“Обмороков и столбняка”, пра якія піша ў лісце да Пагодзіна вялікі самотнік

Мікалай Васільевіч, у мяне не было, але нешта блізкае да іх я перажыў, помню — у

Гаграх.

Перад сном, як у дзяцінстве, раслі, набывалі гіганцкі выгляд усе прадметы.

У дзяцінстве я не баяўся, а, наадварот, чакаў гэтай з’явы, а ў трыццаць год ужо разумеў,

што са мною адбываецца штосьці ненармальнае, і пачынаў, вядома, палохацца —

валасы ўжо ўставалі дыба.

“Сумрачное чувство”, пра якое піша Гогаль, я перажываў і ў

студэнцкія гады,

асабліва ў дні, блізкія да восені, у канцы жніўня, у надвячоркавую пару, варочаючыся

дадому з якіх-небудзь гулянак. Я быў стараннім наглядальнікам танцаў на поплаве,

акружаным рэчкай і старыцамі, што зарасталі лазою, вербамі і алешнікам, чужой

бяседы з чаркаю і падхмеленым рогатам, чужых абдымкаў… Мне падабалася

прывабная маладзіца ў крэп-жаржэтавай лёгенькай сукенцы — жонка п'янага афіцэра ў

фуражцы з блакітным аколышам — ці не лейтэнанта — лётчыка. Я крадком назіраў за

ёю, высочваў усюды… Саромеючыся, вядома, спаткацца твар у твар.

І дадому ішоў з нейкаю апусцелаю душою.

Субота, 15 жніўня 1998 году.

8.05. З першага паверху ажно да мяне на мансарду падымаецца прыемны пах

бліноў. Успамінаюцца вясковыя святы і нядзелі і пухкія на стале грэцкія аладкі.

Частаванне мяне мёдам з аладкамі ў чарадзе дзяцей на цеснаватай кухні, калі ў святні

дзень я прыходзіў да цёткі Настасі. Успамінаецца вялікі гадзіннік з меднымі гірамі на

сцяне між вокнаў.

І калі на прадвесні 1940-га Янкавых (цётчын муж Янка Нагорны быў багацейшы ў

нашай Варакомшчыне) вывозілі ў Акмолінск — ці не сённяшняя Акмала? — бацька

паслаў мяне ў разграбленую ўжо хату, з голымі ложкамі, з нацярушанаю саломаю на

падлозе, я найперш успомніў пра насценны гадзіннік і з радасцю шасцігадовага

хлопчыка пабег туды, спадзеючыся зняць хоць адну медную гіру.

Але ў апусцелай сумнай хаце мяўкаў толькі каток — гадзінніка на сцяне не было.

Зазірнуўшы на кухню, я ўбачыў у выбітай ніжняй шыбе кніжку, якую прыставілі заміж

шкла. Я стаў каленьмі на лаву і выцягнуў бруднаваты польскі лемантар — ён аказаўся

першай кніжкаю ў нашай хаце. Ці не з яго запомніўся верш Марыі Канапніцкай: "Ешчэ

снежак прушы, ешчэ хлодны ранак”.

Запомніўся і той сакавіцкі ранак з лёгкім замаразкам, з шорсткай намараззю на

саламяных стрэхах і на шарай пясчанай вуліцы, атуленай бэзам і абкладзенай абапал

замшэлымі валунамі.

З стрыечнымі братамі (двума з чатырох) я ўбачыўся толькі праз трыццаць чатыры

гады.

Ні з цёткай Настасяй, што памерла ўжо ў Сілезіі (Польшчы вярнулі нямецкія

землі, якія засяляліся палякамі, а разам і беларусамі з Сібіры, Казахстану і Заходняй

Беларусі), ні з стрыечнай сястрою, маёй равесніцай, ні з дзядзькам Янкам, ні з

старэйшымі яго сынамі я ўжо не спаткаўся… Франак загінуў у прадмесці Варшавы

Празе, дзе ішлі зімою 45-га ўпартыя баі, Уладак, прайшоўшы не менш страшнае пекла

— Монтэ-Касіна, застаўся… Можа, яшчэ судзіць доля ўбачыцца з ім.

Нядзеля, 16 жніўня 1998 году.

Як трэба стрымліваць сябе ад гутаркі, асабліва ў транспарце — аўтобусе ці

электрацягніку, — бо наўкруга цябе столькі дуроты — беларускай і наезджай

расійскай.

Бо каму патрэбна твая праведнасць. Быдлу? Як нізка мы ўсе апусціліся. Дарэчы,

гэта і ставіла за мэту расійская імперыя: растаптаць усё нацыянальна свядомае.

А я сказаў усяго адну фразу:

— Я не магу глядзець Беларускае тэлебачанне. Уключыш тэлевізар, а там — альбо

вусы, альбо камбайн.

— А без вусоў не пражывеш! — абярнуўся тлусты лысаваты мужчына.

— Ну чаму? Я вось, напрыклад, не нашу і жыву.

Пятніца, 21 жніўня 1998 году.

Нездароўчасць — болем і звонам напоўненая галава.

У хваробах сваіх я вінаваты сам — цягнуся да чаркі. А трэба пакінуць піць, як

пакінуў курыць. Не куру ўжо роўна дваццаць гадоў.

Зрабіцца вегетарыянцам для мяне было б лішнім, а

ўстрымацца ад гарэлкі я мус.

Бо іншы раз напіваюся да страты прытомнасці. Як гэта здарылася летась ці пазалетась,

калі я ўпаў на стэлаж. Але самы найгоршы — кілішак для здароўя, які рэкамендуюць

нават дактары.

Адкаснуцца трэба ад усялякіх кілішкаў і чарак.

Віна і піва я не ўжываю, калі не лічыць паездку ў Малдову, дзе піў кабернэ.

22.00. Гадзіну назад мы з Мірaславам вярнуліся з яўрэйскага пограбу на пляцы

Волі. Праседзелі доўга, чакаючы — я — курынае філе, ён — нешта бразільскае

(валовіну з фасоляй). А ў нас за спіною дзеразаваліся, свісталі, рагаталі і галёкалі

тоўстыя, як парсюкі на пудоў дванаццаць, няголеныя і нямытыя маладыя свінабоі.

Няма ў Мінску зацішнага кутка. Наўкруга брыда, рэспуст і лукашэнкі.

Аўторак, 25 жніўня 1998 году.

Украінскае “грае ў футбол” адпавядае і нашаму варакомскаму “граць у мячыка”.

Пятніца, 28 жніўня 1998 году.

Гудзе (як) свіння.

Кабыла паліцца.

Авечка міркітуе.

Карова бегаецца (ажно плынь цячэ).

Сучка палюе.

Кошка марцуе.

Трусіха…

Зайчыха

Ваўчыха

Новая хата пахла жывіцаю (смалою)

Жыжа (жыжка) — вогнішча, агонь.

Кабета, чыстая, акуратная, з ружовымі палатнянымі торбачкамі, сівавалосая;

напалову рас., напалову бел. гутарка:

— Муж памёр. Засталася з дваіма дзецьмі. І выгадавала. Не хопіць грошай — у

выхадныя раблю. А ў Расіі — гультаі. Усё быллём зарасло. Лянуюцца нават агарод

пасадзіць.

Наша варакомскае слоўца, якое ўжываў нябожчык бацька, — “збыт усяго” —

знайшоў у славенскім (славацкім) слоўніку — zbytok (zbytkovy) — звышак, лішак.

Тут жа ўспомнілася і вытворнае ад яго — “збыткуе” (дарма, лішне траціць).

Аўторак, 1 верасня 1998 году.

9.30. 1. Івана (Яся) Міхайлава Адамчыка з вёскі Аханяны сын Іосіф (Язэп), 1902

нараджэння, у 1953 годзе браў метрыку (ці не выпіска з Дзятлаўскага архіву ЗАГС).

9.30. 2. Віктар Захар’еў Адамчык. Дачка яго Агаф’я радзілася ў 1891 годзе. Ці не

Вітук Адамчык, што даводзіўся (прыходзіўся) майму дзеду Тодару дзядзькам. Як і

Міхал (Міхалка) Адамчык.

Яны абое, Віктук і Міхалка, былі роднымі братамі Янку Адамчыку, які прыйшоў у

прымы на Аблажэяў участак (Іосіф Аблажэй, Варакомшчына), і Алесю (Аляксандру,

1838–1919), якога Янка паклікаў з Аханянаў на багатую варакомскую гаспадарку сабе

ў помач.

На ўчастку Адамчыкаў у Аханянах (суседняя вёска за 3 км ад Варакомшчыны)

стаіць ужо хата нейкага Бадзюка.

Серада, 2 верасня 1998 году.

7.20. Дзённікі Панчанкі (“Полымя” № 7, 98) — шчырыя, нават запальчывыя. І як

рэфрэн — дамешак газетнай публіцыстыкі. І шнуркі імёнаў, нібы вязанкі сушаных

грыбоў. Сярод іх нямала чарвівых.

Не кажу пра тое, што ён трохі сталініст. Як і шмат хто з яго пакалення. Бацьку

крыўдзіць яны не дазвалялі. Боязь перад сталінскім ботам у іх засталася, як застаецца

нарасць на губе, калі чалавек разаб’ецца дзіцем.

Хоць невядома, чаго тут болей было ў іхняга франтавога пакалення — боязі ці

прызвычаенасці, нават да крыві і жорсткасці. А можа, трохі салдафонства — зманвала

моц улады, неабвержанасць загаду, хоць і неразумнага. Не выпадкова, што яму іншы

раз хацелася, каб усяўладная рука ў рудым рабацінні стукнула па стале.

І ўсё ж вершы яго я найболей любіў і найболей ведаў іх на

памяць. “Гарачыя
вятры”, помніцца, выменяў на салідны дарэвалюцыйны фетаўскі том.

Я цаніў беларускае вершаванае слова. І маладую іскрыстую паэзію Пімена
Панчанкі. Ён для мяне, калі гаварыць па шчырасці, і застаўся паэтам “Гарачых вятроў”.

Панядзелак, 21 верасня 1998 году.

Колеры: папялова-шэры. Як перад змярканнем было неба. Шарая гадзіна. А цяпер
неба сіняе, і сінявата-ліловая чарната пры зямлі.

Жары — ясна-чырвоны, агністы
Мурагі — цёмна-шэры (аб карове)
Мурагі — паласаты (украінскае)
Расовы бык — пляменны
Руно і рунь — адно і тое ж?
Руністы — кучаравы, руністы — зялёны
Дэраш — пёстрый — стракаты
Цагляны
Бэзавы — фіялетавы
Цытрыновы
Крэмавы
Гранатовы — сіні?
Папяловы
Сівы
Цёмна-шары
Ультрамарынавы
Палова
Рудая
? цьмяна-ружовы

Масць коней:
1. Сівы — шэры (серый)
2. Руды — цёмна-чырвоны
3. Гняды — карычневы.

Карова:
Палавая
Пярэстая

Коні:
Каштанавы, буланы
Мышак — сам сівы, а спіна чорная
Ластаўка — карова (чорная, а жывот белы)
Вішня — чырвоная
Зорка — на лобе
Падляска — <як похвы белы, а само чорн>

Каштан — чырвоны

Гняды — чырвоны і чорны, цёмна-чырвоны

Шпак — белы з сівым

Буланы — жоўтай масці

Серада, 23 верасня 1998 году.

Калі вярнуцца ў год 1939-ы, то і я помню збой людзей на ганку перад магазінам.

Мяне, шасцігадовага, бацька ўзяў у мястэчка, каб глянуць, ці ёсць аконнае шкло, —

перад самай вайною, ашчаджаючы і аддаючы апошні грош, бацькі будавалі хату, каб

праз год ці паўтара яна была падпалена нямецкім запальным снарадам, што прашыў

адразу некалькі стрэх.

Тады ў нашай хаце з'явіліся парусінавыя блакітныя туфлі, соль і — кавалак

рудаватага мыла. І нас, малых дзяцей, пачалі збіраць да солтыса ў хату на ўколы і

прышчэпкі… І папяровыя анёлкі з кучаравымі галоўкамі і блакітнымі крыльцамі. Быў

ужо разграблены местачковы касцёл і ксяндзоўская плябанія.

Матчын сваяк, утапіўшы ксяндза, хадзіў у ксяндзоўскім паліто на футравай

падкладцы. Ён быў ці не старшынём сельсавету.

Соловый — па-расійску — жаўтаваты.

Насалавелі вочы — мутныя сталі

Аўторак, 3 лістапада 1998 году.

Разгортваю Жылку. Блізкія выразы, словы і метафары, якія ўжывала маці. А

вершы здаюцца слабаватымі, заквечанымі, там-сям пераймальнымі.

Прыгадваецца шэрая, кішаньковага фармату, яго кніжачка — віленскае

перавыданне зборніка "На ростанях" 1945-га, калі не памыляюся, году. Маё першае

падлеткавае знаёмства з не ўспомненым у школьных падручніках, жорстка/злосна,

бязлітасна выкрасленым энкавэдзісцкаю рукою з літаратурнага ўжытку святым імем

паэта. Іх набіралася ўжо шмат у маёй скупой бібліятэчцы, што змяшчалася на кароткай

палічцы тумбавага карычневага шкапчыка з вырваным замочкам: Арсеннева, Гарэцкі,

Антон Навіна, Вінцук Адважны, Адам Станкевіч. Казіміра

ведаў толькі па адным няпоўным вершы. Як і Алеся Салаўя — па скупой падборцы ў

часопісе “Новы шлях”.

Пятніца, 6 лістапада 1998 году.

Ідзеш праспектам Францішка Скарыны, як ідзеш заштатным, павятовым горадам

Расіі — наўкруга расійская мова і ўсе транспаранты над вуліцай напісаныя па-расійску.

Сіпаты в<…> вынішчае даастатку ўсё нацыянальнае. Коштам (цаною) Беларусі

намагаецца ўшыцца ў маскоўскі Крэмль. Пры нашай пакорнай згодзе і тупой

абыякавасці мы папраўдзе можам стаць Северо-Западным краем.

Няўжо выродзіліся Грынявіцкія?

Для апавядання

Што ёсць сшыткі з белай, нават з сінявата-белай, без стрэмак, паперай, мы

ўбачылі, адкапаўшы ў смецці і друзе, выкінутым на двор з яўрэйскіх хатаў, калі

яўрэйскія сем’і зганялі ў гета, па польскіх, як тады называлі (казалі), зэшытах. Мы

выбіралі спісаныя да палавіны, асабліва па арыфметыцы ў двайную клетку: у большым

квадраце змяшчаўся меншы, выдзелены гусцейшай фарбай. Сшыткі былі з яркімі

чырвонымі палямі. Гэта нас зайздросна здзіўляла.

Там жа, на падворках, у грудах паперы і купах лахманоў, у друзе бітага посуду

валяліся загадкавыя кніжкі з незразумелым, нечытэльным густавата-чорным, нібы

знарок крыўленым і ламаным, шрыфтам.

Я выцягнуў з-пад смецця, узрадавана схапіўшы за кончык, чорную скураную

папружку, але чамусьці без спражкі, а з усечаным конусам-калодкай, абабітай гэтым жа

самым чорным скурацікам. Але ўсё ж пахваліўся:

— А во — папружку знайшоў.

— Гы-гы, — зарагатаў таўстагаловы, з пляскатым носам, старэйшы за нас усіх

Стась Нагорскі. — Гэта ж жыдоўскае багамойла. Выкідай.

Але я моўчкі, скруціўшы чорны скураны пасак з калодкай, зацiснуў у кулаку.

Стасевыя кішэні адтапырваліся ад чарачкаў і кілішкаў. Ён ускараў праз выбітае

акно ўскочыць у хату да буфета, падпільнаваўшы, калі паліцыянт па пільнай патрэбе

схаваўся ў дашчатай будачцы з двума ромбікамі, што стаяла ў глыбі двара. Малады

рослы хлопец, здаецца, яшчэ без уніформы, у хатнім шарачковым пінжаку, у дзюбатай

кепцы, дагнаўшы ўжо на вуліцы, доўгаю/чорнаю гумаю, а дакладней, канчаром

адсечанага кабелю два разы аперазаў сутулаватую Стасеву спіну. Стась ад моцнага і

нечаканага ўдару ажно прысеў.

— Ну, Саладуха, пачакай, — Стась, мусіць, ведаў паліцыянтаву мянушку і

гразіўся ціханька здалёк, не падыходзячы болей да прыгожага, на высокім падмурку і

выфарбаванага ў карычневы колер дому маленькага Давідоўска[га], уладальніка

тартака і дравяных прыстанцыйных складаў, самага багатага яўрэя ў мястэчку. — Сам,

нябось, золата нагроб.

Стася злавілі. Напіўшыся на вяселлі, ён спаў у возе каля гумна. На гэтым возе яго і

прывезлі ў атрад. Стась потым ужо пахваліўся, што гэта яго брат падпільнаваў

Саладуху. На кухні бабы прывязалі да хвойкі галавою ўніз і сталі падпякаць. Стасеў

брат не ўцярпеў і застрэліў яго.

21.00. У “Люстэрку” ці “Падробнасцях” разумнае, чалавечае інтэрв’ю Дзмітрыя

Ліхачова. Яго словы: дзіўна і страшна, што царква (праваслаўная) падтрымлівае

стварэнне піянерскай арганізацыі. Страшна і дзіка: праваслаўе даўно ўжо

энкавэдзісцкая павучыная арганізацыя.

Субота, 7 лістапада 1998 году.

У Нью-Йорку мяне некалі здзівіла колькасць людзей, асабліва пажылых жанчын,

у інвалідскіх каляскach. У пагодныя светлыя дні кастрычніка, яшчэ пяшчотнага і цёплага

там, іх выкочвалі маладыя шакаладныя негрыцянкі. Накрытыя пледам, апранутыя ў

дарагія норкавыя футры, зморшчаныя, сухенькія бабці ў

модных капялюшыках сонна

жмурыліся, падстаўляючы бяскроўны твар ласкаваму сонцу, якое яны, пэўна, і мала

бачылі, лежачы з дня ў дзень на шырокай канапе ў наглуха закратаванай/заблакіраванай

кватэры.

Тут, у Мінску, мяне дзівіць і глыбока, непамысна ўражвае колькасць людзей з

чырвонымі сцягамі, што насустрач парыўнаму ветру і сцюдзёнаму дажджу са снегам,

прыспешваючы, ідуць/ідзе праспектам да чорнага помніка з чорнаю працягнутаю

рукою.

А ці ведае, дзеля чаго і куды ідзе, прымусова выгнаная на дэманстрацыю

студэнцкая моладзь?

21.25. Многія (шмат якія) людзі зніклі з майго гарызонту: Алесь Наўроцкі,

Мікалай Тычына, аднакурснік. Летась я іх ледзьве не штодня сустракаў на праспекце

Скарыны. Дзе яны? Ці жывыя хоць? Як і Сцяпан Міско, зямляк, слонімец.

Аўторак, 10 лістапада 1998 году.

Учора перад сном я ўспамінаў свае дзесяць год. Яны чамусьці аказаліся самымі

выразнымі і памятнымі. Ці таму, што я ўжо сталеў, ці таму, што вайна набывала свой

самы жахлівы, смяротны пік (шчыт). Усюды ішоў разбой: ноччу партызаны

падпальвалі местачковы тартак, склады пры чыгунцы, дэпо вузкакалейкі, удзень

немцы, зрабіўшы аблаву, арыштоўвалі і стралялі людзей, палілі вёскі, куды вёў

партызанскі след. Гінулі падлеткі з суседніх дамоў у Наваельні, дзе мы, пагарэльцы,

кватаравалі. Іх стралялі немцы і партызаны, помсцячы за бацькоў.

Пятніца, 13 лістапада 1998 году.

Аер — ад запалення мач. пухіра (посіка), маляры (трасцы), жаўтачкі.

Бурачнік — ад бяссоння, нерваў, узбуджанасці.

Буквіца (Betonica) — ад запалення посіка.

Валяр'ян — ад нервавай узбуджанасці.

Васілёк — ад запалення нырак і посіка.

Гарыцвет (адоніс) — ад павышанай нервовай узбудж.
Душыца — ад бяссонніцы, нерваў.
Жаруха? — ад запалення посіка і жоўці.
Гравілат — ад хваробы скуры.
Цыкорыя (мацаўнік) — ад сыпкі (сыпу) на скуры, вугроў…
Грыжнік — ад хваробы нырак і посіка.
Доннік — ад закупару венаў, боляў у посіку.
Душыца — ад хваробы нерваў.
Суніцы — ад пігментных плямаў.
Медуніца (смактуха) — ад хваробы посіка.
Мыльнік — ад лускавога лішаю.
Мята — ад непрыемнага паху з роту.
Авёс —
Расходнік — ад трасцы (малярыі).
Чарада — ад алергіі (скуры)
Чыстацел (цыліндра) — ад экзэмы.
Субота, 14 лістапада 1998 году.
6.10. Ужо грукае пад домам электрацягнік метро. Коратка. Як узнікае раптоўна,
так і раптоўна знікае. Нібы ўпала некалькі валуноў.
Малая дзяржава, а колькі фанатычнай самаўпэўненасці, маніякальнага гонару ў
кіраўніцтве. А ўсё ідзе ад шэрасці, хамства, неадукаванасці. І таму пачынаецца працэс
заканамернага вяртання ў сталінскую эпоху — бяспраўя, галечы і духоўнага ўціску.
Вяртанне туды, дзе мы раней не жылі, а існелі.

Нядзеля, 15 лістапада 1998 году.
У дзённікавых запісах Тодара Дастаеўскага (т.24, стар.113): “Усялякая
цывілізацыя пачынаецца з разбэшчанасці (распусты). Прага нажыцца. Зайздрасць і
ганарыстасць…”
У нас, у Беларусі, здаецца, усё ёсць — і распуста, і жаданне найболей мець, і
помслівай зайздрасці нямала, і хамскага, напышлівага гонару даволі, а ці пачнецца
цывілізацыя?
У каго, у якіх дзённіках пра тое прароцтва вычытаць?
Серада, 18 лістапада 1998 году.
16.30. Сёння, ідучы на тралейбусны прыпынак, нечакана пахіснуўся. Гэта я
заўважыў тады, калі мяне аднесла ўбок. Ногі нібы

падагнуліся, і я ледзь устояў,

усведамляючы, што зараз упаду. У вачах пацямнела. Я паспрабаваў ступіць яшчэ адзін

крок, і мяне зноў, як п'янага, закружыла. Да сэрца падкраўся нават страх. І я стаяў

колькі хвілін, чуючы лёгкі шум у галаве, на тратуары насупраць гастраному пад

гадзіннікам. А потым ужо разам з натоўпам паволі рушыў на зялёнае святло святлафора

— што будзе, то будзе.

Падымаючыся з падземнага пераходу на паркавай магістралі, зноў учуў лёгкі шум

у галаве. А ў выдавецтве нібы забыўся пра яго: там галаву затлуміў клопат з выданнем

кніжкі.

Цяпер пішу, нібы абязвечаны ці, праўдзівей, аглушаны, гэтым здарэннем.

Пятніца, 20 лістапада 1998 году.

Сёння ўзгадваў нашыя варакомскія ўрочышчы, што зараслі маладым

трыццацігадовым хвойнікам, і тыя дарогі, што ён ужо назаўсёды ўкрыў… На голым

грудзе, заўсёды ветраным, што называўся Юрашчай (ад слова юр), таксама вышугаў

калматы грыбны лясок. Старое, даўняе ўсё адышло — дарогі, дрэвы…

На ўклейцы ўжо старажытнага "Нового мира" сярод подпісаў членаў рэдкалегіі,

супрацоўнікаў і аўтараў часопісу два подпісы ад беларусаў — Аркадзя Куляшова і

Васіля Быкава. Першы распісаўся па-беларуску — Ар. Куляшоў, другі па-расійску —

В. Быков.

Нібы дробязь, а шмат значыць: хто, дзе і як распісваецца. Хто помніць, што ён

беларус, а хто — не.

Субота, 21 лістапада 1998 году.

Памяць вярнула яшчэ ваенную зіму 43-га ці 44-га году, школу ў пабеленай хаце з

чорным гонтавым дахам, нашу пагарэлую вёску і амаль штодзённую дарогу ўздоўж

незамерзлай рэчачкі, незамерзлых сярод белага снегу крыніц, над якімі, як над гарачым

катлом, курылася ружовая пара, а на іхнім дне, нібы ў бочках

ці кадушках,

расцягнуўшы лапкі, ляжалі сонныя жабы. Іх было шмат.

Нехта з нас спрабаваў, выламаўшы пруцік, яшчэ намагаўся хоць адну з іх дастаць і

выкінуць на снег.

Па гэтай дарозе ў школу іншы раз траплялася яшчэ адна жывая істота —

прыручаны, казалі, немцамі чорны грак. Ён сядзеў на высокім дашчатым плоце з трыма

калючымі драцінамі, што абкружаў ужо спалены партызанамі тартак, і хрыплавата,

галодна каркаў, просячы ў нас хлеба. У рукі дзюбаты чорна-ружовы грак не вельмі

даваўся — палахліва адлятаў. Падпіхаючы каго-небудзь [з] спрытнейшых, мы клалі

хлеб на слупок плоту.

Не меней, як прыручаны грак ці сонныя жабы на дне крыніцы, нас цікавілі і

старыя вуллі ў занядбаным, вымерзлым садку з гарбаю засыпанага снегам пажарышча.

Хату спаліў не помніцца хто — партызаны ці немцы, — гаспадар, калі застаўся жывы,

недзе пераехаў, пакінуўшы дзве старыя рассохлыя калоды з пчоламі. Яны, гэтыя

карычнева-цёмныя скурчаныя істоты, яшчэ варушыліся ў шарых, патрэсканых і

пахучых вуллях з выдранымі верхнікамі. Нехта ж, пэўна, выдзіраў воск.

Адкалупвалі яго і мы і падбіралі калючыя шчоткі пустых сотаў.

Як сённяшнія бамжы, мы абягалі нямецкія сметнікі. Бліскучай фольгаю ад

чакалядаў і прыгожымі пустымі пачкамі ад цыгарэтаў нас прываблівaў той, што быў за

дашчатым туалетам пры хлявушках рабой ад зялёных па белай сцяне мазкоў гасціницы

з кулямётам на адзіным ганку другога паверху.

Мы, дзеці, у вайну былі не менш галодныя і недагледжаныя, кінутыя на самапас,

як гэтыя пакурчаныя ад холаду пчолы.

Не менш цікаваю была і вялікая, гарбатая, з апушчаным хвастом, чорна-рабая

пава, якую насатая гаспадыня іншы раз, асабліва ў адлежныя, цяплейшыя дні

выпускала з белага атынкаванага хлеўчыку.

Панядзелак, 23 лістапада 1998 году.

Першы раз чую, але ўспрымаю як сваё, нашае слова “выніклі” заміж “знікалі”

(Ваўкавыск). “Хрушчы выніклі — пазнікалі ўжо”.

І ўсё ж заміж “сіпаты” трэба пісаць “хрыпаты”.

Ахрып.

Хто-та — нашае. Заміж хтось ці хтосьці.

Худзізна.

Конь худы, дык хоць куды: пастаў хоць дзе — ніхто не ўкрадзе.

Хупаць на акрэплыя рукі. Варакомшчына.

Не ведаў: горшая зямля аўсом засявалася, лепшая — жытам і ячменем.

Хцівы — сквапны.

Серада, 25 лістапада 1998 году.

Свякрова не матуля, дзіця не прытуля.

У расійскіх дыялектах і жаргонах, нават у лагернай песні “Товарищ Сталин, вы

большой учёный”, сустракаецца слова “евонный”, але ж рускія моваведы не ўносяць

гэты займеннік у фонд літаратурнай мовы, а ў нас два дыялектныя слоўцы “ейны” і

“ягоны”, як блізны на палатне ў дрэннай ткачыхі, застракацелі ў публіцыстыцы і прозе

маладзейшых літаратараў.

Як і паланізм — напрыканцы. Толькі ж як спяваць вядомую беларускую песню

“Шумяць вербы [ў] канцы грэблі”.

Пятніца, 27 лістапада 1998 году.

У “Народную волю”, што туліцца ў падвале, занёс (учора) 15 старонак з “Чорнага

адбітка”. Газета, як відаць па апошніх нумарах, прачытаных мною, даволі

непісьменная. Ажно каюся, што заманулася надрукавацца на яе старонках.

Здароўе ўжо растрачана. Самапачуццё найгоршае. Ноччу — болі, калаццё ў

правым боку. Не павярнуцца — кружыцца, як у п’янага, галава. Гараць калені.

Шкодзіць гарэлка, у якую ўжо добра ўцягнуўся альбо, як казала нябожчыца маці,

уружыўся.

Збіраемся з Нінаю ў санаторыю — Міраслаў купіў дзве пуцёўкі. У аўторак, калі

АВІР верне пашпарты, бо яны там, едзем у Брэст, а адтуль — у Жабінку: санаторыя

“Буг” поруч з гэтым мястэчкам.

Не ведаю, якія могуць быць лекі і харчы пры сённяшняй разрусе, высокіх цэнах і

нястачы тавараў. Расія ўцягнула Беларусь у эканамічную прорву. Каб купіць сабе і мне

бялізну, Ніна аб’ездзіла ўвесь Мінск. І прадаюць не больш як па дзве пары, нават трусы

і майкі.

Марную час — перачытваю вершы Танка, ацяжэлыя ўжо, як сырыя калоды, ад яго

ўзнагарод, званняў і бясконцых афіцыйных паездак за рубеж. Некалі звонкія, як

узнёслая сасна, цяпер яны глухія, папраўдзе, нібы адсырэлыя пні.

Падкупленыя, прынаджаныя ўладамі, яны абодва з Панчанкам нечакана аглухлі і

ахрыплі, страціўшы і велічную адвагу паэтаў, і чалавечую прыязнь і шчырасць, ураз

ператварыўшыся ў ссутуленых баязліўцаў.

Паэту, мусіць, патрэбна турма не толькі на пачатку дарогі, але і ў канцы яе. Ад

сытага жыцця жырэе сэрца.

15.05. Недзе ў дзённікавых запісах, напэўна, гэта ёсць, але перапішу з лістка, які

знайшоў у архіўных паперах. Было два га[ды на]зад: кастрычнік, восень. Я варочаўся з

Наваельні ў Мінск. Сеў на спадарожны дзятлаўскі аўтобус, у якім аказаўся Грышан,

былы настаўнік з раготнянскай школы. Ён, расхрабраны ад чаркі, з пахвальбою

расказваў, як яшчэ школьнікам — ці не ў Баранавічах? — са сваім сябрам у клубе

парэзаў партрэт генералісімуса, праўдзівей, выразаў усе ордэны, а сябра крамсаў

Леніна. Іх не злавілі. Хоць усіх вучняў класу выганялі босымі на мароз. Але хто зрабіў

такое, усё ж не даведаліся.

Расказаў ён і пра нашага агульнага знаёмага Сяргея Лазовіка. Бок, сярэдзіна ў яго

балела. Памёр чатыры гады назад ад цырозу печані (1992).

40 % пенсіі палучаў. Жонка

(бухгалтар) таксама піла. Ёсць дачка. Быў інспектарам (Дзятлава), потым працаваў у

школе-інтэрнаце, нарэшце — у васьмігадовай школе ў Жыбартах.

І нарэшце пачалася доўгая да нудоты п’янаватая гутарка пра сябра, што пахіліўся

па бензапілу і зарэзаўся.

Дарога была запамінальная, праз бярозавую замець, міма зялёнай руні, чорных

згалелых садкоў са светлымі яблыкамі.

Чырвоны “Ікарус” з таблічкаю “Дзятлава — Мінск” у выпуклым лабавым шкле.

Сілікатна-блочная Наваельня падтаптала ўжо нашае варакомскае поле. Чароды

дэрмацінавых падлеткаў каля аўтобуснай станцыі. Цыгарэткі ў зубах. Над торбамі з

семечкамі — бабулі. Лёрця з гранёнаю шклянкаю ў руцэ. Насата-надзьмутая братавая ў

стоптаных чаравіках. П’яны настаўнік запрашае зайсці глянуць на хворую жонку.

Сельсавет. Успаміны. Пахілены, струхлелы дом насупраць. Потым — “Ікарус”, а ў ім

— настаўнік з Раготнай, мясцовы паэт з дзвюма пакоўнымі цяжкімі сумкамі. Напэўна,

свежыны, якую вёз у Мінск сваім дочкам.

Публікацыя

Уладзімера Адамчыка